РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
13 МАЯ АЎТОРАК № 90 (30478)

# «ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — АКТЫВІЗАВАЦЦА Ў ЭКАНОМІЦЫ, ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНЫМ КІРУНКУ»

## Беларусь і В'етнам устанавілі ўзровень стратэгічнага партнёрства



Фота БелТА.

Панядзелак стаў пунктам адліку новага этапу ў супрацоўніцтве Беларусі і В'етнама. У Палацы Незалежнасці Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з Генеральным сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама То Ламам. Дэлегацыя гэтай краіны знаходзіцца ў нашай краіне з афіцыйным візітам.

### ШМАТ ПУНКТАЎ СУДАКРАНАННЯ: АБ СУМЕСНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

В'етнам для Беларусі — партнёр не новы. Ужо не адзін дзясятак гадоў нашы краіны плённа супрацоўнічаюць, умацоўваючы свае адносіны ў розных сферах. І ўвесь гэты час В'етнам застаецца для Беларусі важным і перспектыўным партнёрам. Рынак В'етнама — адзін з лідараў па развіцці ў азіяцкім рэгіёне. А краіну нават называюць новым азіяцкім тыграм — такім неафіцыйным тэрмінам абазначаюць краіны, эканоміка якіх дэманструе высокія тэмпы росту. У Беларусі і В'етнама шмат пунктаў судакранання. Напрыклад, перапрацоўчая прамысловасць, індустрыя высокіх тэхналогій, электроніка, хімічная прамысловасць, сельская гаспадарка. Гэтыя галіны, якія з'яўляюцца прыярытэтнымі для в'етнамскай эканомікі, паспяхова развіваюцца і ў Беларусі. Таму поле для сумеснай дзейнасці шырокае.

СТАР. 2–3

ЛЕТА Ў ВЁСЦЫ: АДПАЧЫНАК З ГУСТАМ



7

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# БЕЛАЕ ЗОЛАТА

## Як развіваецца айчынная малочная жывёлагадоўля?



Вытворчасць малака можа быць інтэнсіўнай і экстэнсіўнай: гэта вельмі розныя падыходы, са сваімі плюсамі і мінусамі. Беларусь пайшла па шляху інтэнсіўнай жывёлагадоўлі, у аснове якой — перадавыя тэхналогіі. Гэта дазваляе нарошчваць аб'ёмы атрымання малака, але як уплывае на яго якасць? Пра гэта разважае доктар сельскагаспадарчых навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, намеснік генеральнага дырэктара НПЦ па жывёлагадоўлі Уладзімір ЦІМАШЭНКА.

СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X

# «ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — АКТЫВІЗАВАЦЦА Ў ЭКАНОМІЦЫ, ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНЫМ КІРУНКУ»



## «КАБ ПОСПЕХІ БЫЛІ ЯШЧЭ БОЛЬШ ВАЖКІМІ»: АБ ГАТОЎНАСЦІ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ

Аляксандр Лукашэнка асабіста сустрэў высокага госця ў Палацы Незалежнасці. Цырымонія традыцыйная — з удзелам роты ганаровай варты, гімнамі абедзвюх краін і пратакольнай фотаздымкай у зале ўрачыстых цырымоній. І адразу пасля цырыманіялу — канкрэтная размова для рэальных вынікаў. Найперш пагаварылі ў вузкім складзе.

То Лам не першы раз наведвае Беларусь. На пасадзе міністра грамадскай бяспекі В'етнама ён прыязджаў у 2017, 2019 і 2022 гадах. «Хачу павіншаваць вас з новай працай, вельмі адказнай працай па мерках В'етнама. Хачу запэўніць вас, што нашы адносіны будуць толькі паляпшацца і дамоўленасці, якія мы зацвердзілі з В'етнамам, будуць няўхільна выконвацца. Мы нацэлены з вамі, дамоўленасць такая ёсць — аб стратэгічным партнёрстве паміж Беларуссю і В'етнамам», — прывітаў госця Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў адносін Беларусі і В'етнама вялікая прыгожая гісторыя, гісторыя сумеснай барацьбы за незалежнасць В'етнама і яго народа. «І, назіраючы за тым, як развіваецца праз дзясяткі гадоў пасля той страшнай вайны В'етнам, мы радуемся за вашы поспехі. Гатовыя супрацоўнічаць у імя таго, каб гэтыя поспехі былі яшчэ больш важкімі», — запэўніў ён.

У кастрычніку 2024 года на палях саміту БРІКС у Казані в'етнамскім партнёрам быў прапанаваны план сумесных дзеянняў на найбліжэйшую перспектыву, на 2025—2027 год. «Думаю, што мы зробім усё для таго, каб рэалізаваць усё намечанае ў гэтай дарожнай карце», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. Па словах Прэзідэнта, на парадку дня ёсць і пытанні, якія трэба вырашаць аператыўна. «Калі мы дасягнем сумеснага рашэння, то ў найбліжэйшы час іх рэалізуем. Няхай гэта будуць узаемныя плацяжы паміж дзвюма дзяржавамі, няхай гэта будуць авіяцыйныя зносіны — усё, што з імі звязана. Гэта тыя пытанні, без якіх эканоміка функцыянаваць не можа і людзі жыць не могуць», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок гатовы да ўзаемных паставак тавараў.

«Думаю, нам не варта рабіць шмат намаганняў для таго, каб павялічыць гэтыя аб'ёмы. Таму што вопыт працы ў нас ужо ёсць. Мы гатовыя з вамі ствараць сумесныя вытворчасці той тэхнікі, у якой зацікаўлены В'етнам», — прапанаваў ён.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле слоў Прэзідэнта, адкрыта можна гаварыць аб тым, што Беларусь і В'етнам інтэнсіўна супрацоўнічалі ў галіне ваеннапрамысловага комплексу, паставак нашых узораў узбраенняў у В'етнам. «Калі вам гэта будзе цікава, мы гатовыя гэта аднавіць. І чакаем вас на выставе гэтай прадукцыі Milex у Мінску ў найбліжэйшыя дні», — адзначыў ён.

«Словам, мы гатовыя абмеркаваць увесь комплекс пазначаных і іншых пытанняў, якія ўзнікнуць у в'етнамскага боку. І гатовыя не толькі іх абмеркаваць, але і прыняць адпаведныя рашэнні», — рэзюмаваў беларускі лідар.

У сваю чаргу То Лам падзякаваў за цёплую гасціннасць. Ён таксама павіншаваў кіраўніка беларускай дзяржавы з 80-годдзем Перамогі над фашызмам. То Лам гэтак жа павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з абраннем на пасаду Прэзідэнта з высокім даверам народа. «Я веру, што пад вашым кіраўніцтвам Беларусь працягне развівацца, дасягаць вялікіх поспехаў і абараніць свой суверэнітэт, бяспеку, забяспечыць мір і росквіт і ўмацуе свае пазіцыі на міжнароднай арэне», — падкрэсліў ён.

Па словах Генеральнага сакратара ЦК, нягледзячы на тое, што свет змяняецца, сяброўства В'етнама і Беларусі будзе ўмацоўвацца. Ён звярнуў увагу, што адносіны паміж краінамі развіваюцца ўжо 33 гады. «І я ўпэўнены, што мы і далей будзем умацоўваць нашы двухбаковыя адносіны. Мы з'яўляемся блізкімі сябрамі, разам развіваем нашы традыцыйныя адносіны, унутраныя рынкі», — сказаў ён.

Генеральны сакратар падкрэсліў, што ў рамках свайго візіту хацеў бы абмеркаваць пытанні, вырашэнне якіх будзе садзейнічаць не толькі наладжванню двухбаковых адносін, але ўзвядзе іх і да ўзроўню стратэгічнага партнёрства.

## «МЫСЛІМ АДНОЛЬКАВЫМІ КАТЭГОРЫЯМІ»: АБ УЗАЕМАРАЗУМЕННІ

Перагаворы працягнуліся і ў шырокім складзе, з удзелам членаў дэлегацыі. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў складзе аўтарытэтнай дэлегацыі В'етнама — усё партыйнае кіраўніцтва, у тым ліку рэгіянальнае, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, вядучых сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі прамысловых, навуковых колаў. «Мы ўважліва сочым за развіццём В'етнама, рэформамі, якія праводзяцца, бачым поспехі, якія ажыццяўляюцца пад мудрым кіраўніцтвам Кампартыі, якая ў гэтым годзе адзначыла сваё 95-годдзе», — распавёў Аляксандр Лукашэнка.

З пачуццём глыбокай павагі ён павіншаваў в'етнамскіх сяброў з 50-годдзем вызвалення і ўз'яднання краіны. Беларускі лідар нагадаў, што ва ўрачыстасцях з гэтай нагоды ў горадзе Хашыміне прынялі ўдзел беларускія парламентарыі, а жаночыя асацыяцыі дзвюх краін арганізавалі фотавыставу «Прыгажосць і гераізм жанчын Беларусі і В'етнама». «Гэта чарговы раз пацвярджае, што мы з вамі мыслім аднолькавымі катэгорыямі і ідзём адзіна правільным шляхам захавання гістарычнай памяці.

**І, як вы казалі, гістарычная памяць, гісторыя нашых адносін у нас вельмі доўгая. Такі падыход, арыентаваны на пераемнасць пакаленняў, забяспечвае стваральнае развіццё сучаснага грамадства і прадвызначае будучыню нашых дзяржаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт нагадаў, што яшчэ ў 2015 годзе ў Ханоі назваў В'етнам стратэгічным партнёрам. «Ён з'яўляецца нашым надзейным сябрам у Паўднёва-Усходняй Азіі. Гэта адпавядае выбранаму намі курсу сумесна паслядоўна развіваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва на карысць народаў дзвюх краін», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што за апошнія гады Беларусі і В'етнаму ўдалося прасунуцца па многіх пытаннях. У 2025 годзе ўступіла ў сілу пагадненне аб узаемнай адмене віз для ўладальнікаў нацыянальных пашпартоў. Літаральна месяц таму ў Ханоі прайшло пасяджэнне беларуска-в'етнамскай міжурадавай камісіі па гандлёваэканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. «Галоўная задача — актывізавацца ў эканоміцы, гандлёва-эканамічным кірунку, — пазначыў ключавую мэту беларускі лідар. — Гэта датычыцца аднаўлення рэгулярных паставак у В'етнам беларускай сельскагаспадарчай, грузавой, кар'ернай тэхнікі. Упэўнены ў перспектыўнасці сумеснай вытворчасці беларускіх трактароў і аўтамабільнай тэхнікі. Рэалізацыя сумесных навукова-тэхнічных праектаў, укараненне іх вынікаў у эканоміку, а таксама абмен найноўшымі тэхналогіямі дасць магчымасць павысіць бяспеку нашых дзяржаў».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў 2024 годзе адносіны паміж дзвюма краінамі яшчэ больш умацаваліся за кошт развіцця народнай дыпламатыі па лініі маладзёжных, грамадскіх арганізацый, экспертных колаў, медыяструктур. Ён выказаў надзею на захаванне гэтай станоўчай дынамікі.

## «ЗАКРЫТЫХ ТЭМ НЯМА»: АБ АДНОСІНАХ ПАМІЖ ДЗЯРЖАВАМІ

Прыярытэтнымі кірункамі, па словах Аляксандра Лукашэнкі, застаюцца адукацыя, культура, спорт, турызм. «Яшчэ раз хачу падкрэсліць: закрытых тэм у адносінах паміж нашымі дзяржавамі даўно няма. І мы гатовыя для В'етнама рабіць усё тое, што вам трэба. Усё, што вам спадабаецца падчас вашага візіту і будучых візітаў высокіх службовых асоб і прадстаўнікоў народа вашай краіны», — запэўніў Прэзідэнт.

То Лам прызнаўся, што вельмі рады вярнуцца ў Беларусь на новай пасадзе. «В'етнам уважліва сочыць і радуецца сацыяльна-эканамічным дасягненням, якіх Беларусь дамаглася за апошні час пад вашым кіраўніцтвам», — сказаў ён. Генеральны сакратар падкрэсліў, што адносіны Беларусі і В'етнама бяруць свой пачатак яшчэ з савецкага часу, у прыватнасці з 1957 года, калі прэзідэнт Хо Шы Мін наведаў Мінск. «В'етнам памятае і ўдзячны за тую падтрымку, якую беларускі народ аказаў в'етнамскаму народу ў барацьбе за нацыянальную незалежнасць, у справе нацыянальнага будаўніцтва і развіцця», — адзначыў То Лам.

## УСТАНАЎЛЕННЕ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА — РАШЭННЕ ЛАГІЧНАЕ І ЗАКАНАМЕРНАЕ

Па выніках перагавораў быў падпісаны шэраг дакументаў, накіраваных на ўмацаванне двухбаковых адносін. Ваенныя ведамствы Беларусі і В'етнама падпісалі пратакол аб намерах па ўмацаванні супрацоўніцтва ў галіне навучання ваеннаслужачых і спецыялістаў. Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі і Міністэрства навукі і тэхналогій В'етнама падпісалі Мемарандум аб узаемаразуменні аб супрацоўніцтве ў сферы лічбавай трансфармацыі і лічбавай эканомікі. Аналагічны дакумент у сферы навукі, тэхналогій і інавацый з в'етнамскімі калегамі падпісаў Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях. Супрацоўніцтва Беларусі і В'етнама ў галіне культуры на 2026—2028 гады будзе рэгуляваць адпаведная праграма, якую Міністэрства культуры Беларусі заключыла з Міністэрствам культуры, спорту і турызму В'етнама. Праграма супрацоўніцтва на 2025—2027 гады падпісана паміж міністэрствамі юстыцыі. Міністэрствы аховы здароўя Беларусі і В'етнама прынялі Мемарандум аб супрацоўніцтве ў сферы фармацэўтыкі. Пагадненне аб супрацоўніцтве падпісана паміж Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Беларусі і радыё «Голас В'етнама». Мемарандум аб узаемаразуменні заключылі Беларускае таварыства

дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі і В'етнамскі саюз таварыстваў дружбы.

Ключавы дакумент падпісалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і генеральны сакратар ЦК Камуністычнай партыі В'етнама То Лам. Гэта сумесная заява аб устанаўленні стратэгічнага партнёрства паміж дзвюма краінамі. Цырымонія падпісання і абмену тэкстамі міжнародных дакументаў адбылася пасля перагавораў на вышэйшым узроўні.

У прысутнасці журналістаў і членаў дэлегацый ва ўрачыстай абстаноўцы Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў То Лама ордэнам Дружбы народаў. Гэтай узнагароды То Лам удастоены за значны ўклад у развіццё і ўмацаванне дружалюбных адносін, стратэгічнага партнёрства паміж Беларуссю і В'етнамам. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ўзнагароджанне То Лама вышэйшай узнагародай, якой ушаноўваюць замежных сяброў, — не «пратакольная рэч». «Гэта ўзнагарода за той вялікі ўклад, які ўнёс цяперашні генеральны сакратар у справу ўмацавання нашага супрацоўніцтва», — заявіў ён. — Дзякуючы яму мы выратавалі нашы адносіны — Беларусі і В'етнама і выводзім іх на самы высокі ўзровень. Я ўпэўнены, што з гэтым чалавекам мы зробім вельмі шмат для таго, каб падмурак нашых адносін ніхто не змог не тое што разбурыць, але нават дакрануцца да яго».

Аляксандр Лукашэнка назваў гэты візіт Генеральнага сакратара ЦК гістарычным у плане ўзмацнення адносін Беларусі і В'етнама. І распавёў, якія дамоўленасці былі дасягнуты.

«Без усялякага перабольшання новай вехай у адносінах дзвюх краін стала прыняцце сумеснай заявы аб устанаўленні стратэгічнага партнёрства паміж Беларуссю і В'етнамам. Рашэнне для нас цалкам лагічнае, заканамернае і наспелае. В'етнам — адзін з ключавых партнёраў Беларусі ў Паўднёва-Усходняй Азіі, і ў аснове нашага супрацоўніцтва ляжыць шчырае сяброўства і падтрымка.

Строга прытрымліваючыся гэтых прынцыпаў, мы ўпэўнена працягваем рух наперад і нацэлены на якаснае і доўгатэрміновае ўзаемадзеянне», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што падчас перагавораў самую сур'ёзную ўвагу аддалі прамысловасці, перш за ўсё машынабудаванню. Па яго словах, меркаванні тут цалкам супадаюць: неабходна аднавіць рэгулярныя пастаўкі в'етнамскім спажыўцам беларускай кар'ернай тэхнікі, грузавікоў і, вядома, легендарных для В'етнама трактароў «Беларус». Прэзідэнт расказаў, што бакі дамовіліся максімальна паскорыць рэалізацыю праекта па стварэнні на пляцоўцы нашых сяброў зборачнай вытворчасці беларускіх трактароў, а таксама тэхнікі Мінскага аўтамабільнага завода, у тым ліку для паставак у іншыя краіны рэгіёна. Сельская гаспадарка і пастаўкі прадуктаў харчавання — традыцыйна сярод галоўных пытанняў парадку дня. «Таксама прынялі рашэнне актывізаваць узаемадзеянне ў навукова-тэхнічнай сферы і правесці ў 2025 годзе чарговае пасяджэнне сумеснай беларуска-в'етнамскай камісіі па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

Дарэчы, на гэтае пытанне асаблівую ўвагу звярнуў і Генеральны сакратар ЦК. «Пытанне забеспячэння тэхналагічнай бяспекі і суверэнітэту з'яўляецца стратэгічна важным для ўсіх без выключэння дзяржаў, і працяглыя перапынкі ў рабоце гэтай камісіі з улікам імклівых тэмпаў развіцця навукі і тэхнікі сёння проста непрымальныя», — працягнуў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка распавёў пра дамоўленасць больш шчыльна працаваць у сферы адукацыі. Дамовіліся асаблівую ўвагу ўдзяліць пытанню падрыхтоўкі в'етнамскіх вучоных на базе беларускіх навуковых устаноў.

## «ВАЖНЫ, АКТУАЛЬНЫ І СВОЕЧАСОВЫ»: АБ ВІЗІЦЕ В'ЕТНАМСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

Закранулі таксама прамыя сувязі паміж рэгіёнамі дзвюх краін. «Тут у нас вельмі вялікі нерэалізаваны патэнцыял. Упэўнены, што паспяхова праведзеная ў В'етнаме адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа дасць новы імпульс міжрэгіянальнаму ўзаемадзеянню, узбагаціць супрацоўніцтва новымі ідэямі і праектамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што ёсць прыкметны прагрэс ва ўмацаванні двухбаковых гуманітарных сувязяў.

Беларускі лідар нагадаў, што з 30 студзеня 2025 года паміж нашымі краінамі дзейнічае бязвізавы рэжым. Ён зрабіў акцэнт на тым, што наспела пытанне хутчэйшага адкрыцця прамых авіязносін паміж Беларуссю і В'етнамам. «І, як сказаў Генеральны сакратар, нашы людзі пачынаюць інтэнсіўна мець зносіны, а таксама бізнесмены. Увёўшы рэйсы авіязносін, мы інтэнсіфікуем гэты працэс», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што і правядзенне дзён Ханоя ў Мінску, якія стартуюць сёння, будзе садзейнічаць умацаванню беларуска-в'етнамскаму сяброўству, гуманітарных і культурных сувязяў паміж народамі.

«Яшчэ раз хачу падзякаваць таварышу Генеральнаму сакратару Цэнтральнага камітэта Кампартыі В'етнама за грунтоўную і прадметную размову, за яго нязменную падтрымку і асабістую ўцягнутасць у работу па ўсебаковым развіцці беларуска-в'етнамскага супрацоўніцтва», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Але, зрабіў акцэнт ён, на гэтым праца не заканчваецца. У дэлегацыі В'етнама на панядзелак запланавана каля дзесяці двухбаковых сустрэч на ўзроўні міністэрстваў і ведамстваў, дзе будуць абмяркоўвацца пытанні рэалізацыі ўсіх дамоўленасцяў.

«У найбліжэйшай перспектыве мы дапрацуем план нашых сумесных дзеянняў на найбліжэйшыя тры і больш гадоў — «дарожную карту» па далейшым развіцці нашага супрацоўніцтва і падпішам яе ў ходзе чарговай сустрэчы на вышэйшым узроўні», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама падзякаваў То Ламу за запрашэнне наведаць В'етнам. «Абяцаю, што ў найбліжэйшы час мы з вамі сустрэнемся ў вас на Радзіме і зможам пачатак сённяшніх пагадненняў і дамоўленасцяў у нечым рэалізаваць. Мне здаецца, мы напрацуем яшчэ шэраг прынцыповых канкрэтных пагадненняў і падпішам ужо ў вашай сталіцы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён яшчэ раз падзякаваў То Ламу за візіт у Беларусь. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён быў вельмі важным і актуальным. А самае галоўнае — своечасовым».

**Афіцыйна**

## Аляксандр Лукашэнка 14 мая правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагва

Кіраўнікі дзяржаў на сустрэчы ў вузкім і пашыраным складах абмяркуюць стан двухбаковага супрацоўніцтва, ход рэалізацыі існуючых і новых перспектыўных праекты, у тым ліку ў гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах.

Плануецца, што лідар Зімбабвэ наведае ў Беларусі шэраг прадпрыемстваў і знакавых месцаў.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

## «У НАС ЁСЦЬ ДОБРЫЯ МАГЧЫМАСЦІ»: АБ ДВУХБАКОВЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

То Лам расказаў журналістам, што мае мэтай сумеснымі намаганнямі вывесці адносіны дзвюх краін на новыя вышыні. Перагаворы з беларускім лідарам ён назваў вельмі паспяховымі. Генеральны сакратар звярнуў увагу, што трывалую аснову для далейшага ўзаемадзеяння Беларусі і В'етнама стварае падпісаная Заява аб устанаўленні стратэгічнага партнёрства. «Пакуль свет развіваецца складана, у нас з вамі ёсць добрыя магчымасці», — падкрэсліў ён.

То Лам пералічыў, якія сферы прадстаўляюць найбольшую ўзаемную цікавасць і на якіх напрамках засяродзяцца бакі. Сярод іх — пашырэнне палітычных і дыпламатычных кантактаў, абмен дэлегацыямі на ўсіх узроўнях па лініі партыі, дзяржавы, урада, стварэнне ўмоў для зносін паміж людзьмі, павышэнне эфектыўнасці існуючых механізмаў супрацоўніцтва і стварэнне новых.

То Лам расказаў таксама аб дамоўленасцях актывізаваць сувязі ў абароне і забеспячэнні бяспекі. Тут гаворка ішла як пра традыцыйныя напрамкі, напрыклад, абаронную прамысловасць, ваенную медыцыну, падрыхтоўку кадраў, так і пра тыя, развіццё якіх запатрабавана часам — інфармацыйная бяспека і кібербяспека.

Дасягнута дамоўленасць аб больш поўнай рэалізацыі патэнцыялу і пераваг пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паміж В'етнамам і ЕАЭС. «Будзем ствараць умовы, каб бізнесмены вывучалі рынак, удзельнічалі ў выторчым і дзелавым супрацоўніцтве», — сказаў То Лам.

Таксама ўзаемную цікавасць уяўляюць такія сферы, як лічбавая эканоміка і лічбавая трансфармацыя, сельская гаспадарка, прамысловасць, энергетыка, выкарыстанне ядзернай энергетыкі ў мірных мэтах, транспарт і лагістыка, банкаўская справа. То Лам заявіў пра гатоўнасць В'етнама выступіць мостам для развіцця супрацоўніцтва паміж АСЕАН і Беларуссю.

Зносіны Аляксандра Лукашэнкі і То Лама працягнуліся і падчас афіцыйнага абеду ад імя Прэзідэнта Беларусі. А затым па добрай традыцыі Генеральны сакратар ЦК Камуністычнай партыі В'етнама пасадзіў дрэва на Алеі ганаровых гасцей Палаца Незалежнасці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

**У тэму**

## Ад прадуктаў харчавання да трактароў — чым Беларусь можа быць карыснай для В'етнама

Перагаворы дзеля перагавораў — гэта не беларускі сцэнарый. Не сакрэт, што Прэзідэнт патрабуе ад адказных асоб канкрэтных дзеянняў у рэалізацыі дамоўленасцяў з замежнымі партнёрамі. Таму ўсё, аб чым у панядзелак дамовіліся беларускі і в'етнамскі бакі, не застанецца на паперы. Тым больш што мэту супрацоўніцтва з В'етнамам Аляксандр Лукашэнка агучыў зразумелую і канкрэтную — актывізавацца ў эканоміцы. Даведаліся ў профільных міністраў, якім чынам яна будзе дасягнута.



**Міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ** звярнуў увагу, што склад в'етнамскай дэлегацыі сведчыць: краіна зацікаўлена абмеркаваць з беларускімі партнёрамі ўсе кірункі супрацоўніцтва і прыняць сур'ёзныя рашэнні на вышэйшым узроўні.

«Для нас вельмі важным з'яўляецца падпісанне сумеснай заявы лідараў нашых краін аб вывадзе супрацоўніцтва на ўзровень стратэгічнага партнёрства. Гэта дае дадатковыя магчымасці для развіцця супрацоўніцтва ва ўсіх галінах. Гэта самы вялікі сігнал усім арганізацыям, кампаніям, міністэрствам В'етнама аб тым, што Беларусь з'яўляецца стратэгічным партнёрам, што з намі не толькі можна, але і трэба развіваць адносіны і ставіцца пры развіцці гэтых адносін да нас як да стратэгічнага партнёра», — растлумачыў міністр.

Па яго словах, удасканаленню адносін Беларусі і В'етнама садзейнічаюць і гістарычныя сувязі, і падобная культурная ментальнасць. «Мы крыху ў розных полюсах, але стаўленне да жыцця, працавітасць, выпрацаваныя за доўгія гады пад акупацыяй, альбо барацьба за сваю незалежнасць, пачуццё важнасці міру, стваральнай працы, міралюбная знешняя палітыкі нас збліжаюць», — дадаў Максім Рыжанкоў.



**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый ГОРЛАЎ** расказаў журналістам, што Беларусь пастаўляе ў В'етнам малочную прадукцыю, сухія малочныя прадукты, вялікім попытам карыстаецца цэльнае малако, спакаванае ў тэтрапак. Падчас візіту беларускіх спецыялістаў у В'етнам былі дасягнуты дамоўленасці па пастаўках ялавічыны на рынак В'етнама. «Пройдзены доўгі шлях, в'етнамскі бок ужо пацвердзіў нашай краіне ветэрынарныя сертыфікаты, па якіх мы будзем пастаўляць сваю прадукцыю. Засталося ўдакладніць пэўныя дакументы, і ў найбліжэйшы час мы зможам пастаўляць на рынак В'етнама ялавічыну», — расказаў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання. Аналагічная работа праводзіцца для атрымання ветэрынарных сертыфікатаў для паставак свініны і мяса птушкі. У цэлым, па словах міністра, усе харчовыя прадукты, што вырабляюцца ў Беларусі, могуць экспартавацца ў В'етнам. У сваю чаргу Беларусь закупляе ў В'етнама рыс, морапрадукты, садавіну. А паколькі імпарт харчовых тавараў пакуль перавышае экспарт, яшчэ ёсць вялікі рэзерв для таго, каб павялічыць пастаўкі нашай прадукцыі на рынак В'етнама.

Што тычыцца прамысловасці, то адным з наступных праектаў па арганізацыі сумеснай вытворчасці разглядаецца выраб у В'етнаме трактароў. Пра гэта журналістам расказаў **міністр прамысловасці Аляксандр ЯФІМАЎ.** «Пачынаем праект з магутнага раду 50 конскіх сіл. І ў далейшым праект патэнцыяльна можа быць пашыраны да любых мадэляў, мадыфікацый, якія ёсць у лінейцы нашага трактарнага завода», — расказаў міністр.



Па яго словах, супрацоўніцтва з В'етнамам — гэта важны элемент стратэгіі па дыверсіфікацыі беларускага экспарту. Шэраг праектаў завязаны не проста на пастаўку гатовай прадукцыі, але і на арганізацыю зборачных вытворчасцяў у В'етнаме. В'етнамскія зборачныя вытворчасці нацэльваюцца на экспарт у трэція дзяржавы. Як паспяховы прыклад Аляксандр Яфімаў прывёў вытворчасць грузавой тэхнікі розных мадэляў. Па яго словах, тут добрыя перспектывы.

«Для нас традыцыйным кірункам экспартных паставак, вядома ж, з'яўляецца пастаўка трактарнай прадукцыі, прычым у комплексе з тэхналогіямі, якія прымяняюцца з нашымі трактарамі. Гэта навясныя і прычапныя рабочыя органы. Дэлегацыя В'етнама будзе наведваць Мінскі трактарны завод, дзе зможа пераканацца ў вялікім мадэльным шэрагу не толькі трактароў як канчатковага прадукту, але і ўсяго шлейфа тэхнічнага абсталявання. Наша перавага ў тым, што мы не проста ўваходзім з продажамі, але ідзём на лакалізацыю вытворчасці ўнутры дзяржавы, на навучанне персаналу як вытворчага, так і сэрвісных спецыялістаў. Мы разумеем важнасць задачы якаснага абслугоўвання нашай прадукцыі, таму што ў наступным ад гэтага шмат у чым будзе залежаць поспех далейшых экспартных паставак», — падкрэсліў Аляксандр Яфімаў.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ЗНАКАВЫ ПРАЕКТ

## Адбылося знаёмства в'етнамскіх гасцей з беларускай тэхнікай

Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН і Генеральны сакратар ЦК Кампартыі В'етнама То Лам наведалі Мінскі трактарны завод.

— Рады вітаць вас на нашым Мінскім трактарным заводзе, — вітаў госця кіраўнік беларускага ўрада.

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, тут Генсеку ЦК Кампартыі В'етнама прадставілі прадукцыю завода, а таксама мадэрнізаваную тэхніку вытворчасці МАЗ, «Гомсельмаша» і «Мотавелазавода».

Дарэчы, за ўсю гісторыю ўзаемадзеяння Мінскага трактарнага завода з В'етнамам у гэтую краіну было пастаўлена 14 900 трактароў.

Сёння прапрацоўваецца пытанне аб арганізацыі зборачнай вытворчасці ў В'етнаме.

На думку Аляксандра Турчына, вытворчасць сумеснага трактара будзе знакавым для Беларусі і В'етнама праектам.

У прыватнасці, плануецца зборка трактароў «BELARUS-451» магутнасцю 50 конскіх сіл для работы на рысавых палях з лакалізацыяй прадукту не менш за 45 %. Магчыма і далейшая рэалізацыя гэтай тэхнікі ў Паўднёва-Усходняй Азіі.

У планах — вытворчасць не менш за 1000 трактароў у год.

Таксама ўчора прайшлі перагаворы Аляксандра Турчына і То Лама. Іх падрабязнасці — у наступным нумары «Звязды».

МІЖПАРЛАМЕНЦКІ ДЫЯЛОГ

# МІРАЛЮБІВЫЯ КРАІНЫ З ПАДОБНЫМІ ПАЗІЦЫЯМІ

## Падрабязнасці сустрэчы спікераў Нацыянальнага сходу з Генеральным сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама

Спікеры звярнулі ўвагу на тое, што візіт у нашу краіну Генсека ЦК Камуністычнай партыі В'етнама мае важнае палітычнае значэнне для беларуска-в'етнамскіх адносін.

Па словах **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ,** для Беларусі важна супрацоўнічаць з В'етнамам абсалютна па ўсіх кірунках. «Гэта эканоміка, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, гуманітарная сфера, — канкрэтызавала яна. — Для нас, парламентарыяў, вельмі важнае парламенцкае супрацоўніцтва, і яно развіваецца дастаткова паспяхова. Цяпер час вельмі няпросты, і для нас, парламентарыяў, вельмі важна адстойваць свабоду, незалежнасць, суверэнітэт нашых краін. Мы шчыра рады таму, што на міжнародных пляцоўках у нас з В'етнамам вельмі падобныя пазіцыі: мы міралюбівыя краіны і хочам жыць і працаваць, развіваць свае краіны ў міры і згодзе, найперш абараняючы свой суверэнітэт і незалежнасць».

Паміж парламентамі абедзвюх краін падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, працуюць групы сяброўства. «У заяве, якая была агучана вамі і Прэзідэнтам нашай краіны, адзначана, што нам неабходна абнавіць пагадненне паміж нашымі парламентарыямі, — сказала спікер. — Мы нацэлены на гэтую работу і будзем з нашымі калегамі рабіць усё для таго, каб адпрацаваць новае пагадненне аб супрацоўніцтве паміж парламентамі нашых краін».

Наталля Качанава адзначыла важнасць рэгіянальнага супрацоўніцтва. «На сёння ў нас падпісана 13 пагадненняў аб супрацоўніцтве, але, разумеючы, што ў В'етнаме 58 правінцый, мы лічым, што гэтага недастаткова, таму накіраваны і тут працаваць больш эфектыўна ў плане рэгіянальнага супрацоўніцтва, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** падпісаная паміж краінамі заява аб устанаўленні стратэгічнага партнёрства пацвярджае вялікія перспектывы развіцця двухбаковых адносін. «Ужо сёння падпісаны шэраг пагадненняў па розных кірунках, якія датычацца і абароннага сектара, і ваенна-прамысловага комплексу, і сістэмы аховы здароўя, культуры, адукацыі — гэта сведчыць аб далейшых перспектывах развіцця нашых адносін, — канстатаваў ён. — Мы радуемся вашым поспехам, ведаем, як дынамічна развіваецца В'етнам, як развіваецца ваша эканоміка, дастаткова высокімі тэмпамі».

Спікер падкрэсліў, што задача парламентарыяў — берагчы, захоўваць, развіваць добрыя традыцыі беларуска-в'етнамскага сяброўства. «Асаблівую важнасць мы надаём наладжванню дзелавых сувязяў, тым больш што выкарыстанне пераваг магчымасцяў Пагаднення аб свабодным гандлі паміж ЕАЭС і В'етнамам, якому сёлета спаўняецца дзесяць гадоў, дае магчымасць паглыблення гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, — адзначыў Ігар Сергяенка. — Прынцыповая лінія парламенцкай дыпламатыі заключаецца ў тым, каб умацоўваць чалавечыя, гуманітарныя сувязі».

У сваю чаргу **Генеральны сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама То Лам** павіншаваў нашу краіну з дасягненнямі, якіх мы дабіліся ў развіцці краіны, забеспячэнні сацыяльнай бяспекі і ўмацаванні пазіцый у рэгіёне, у цэлым у свеце. «Мой візіт у Беларусь накіраваны на тое, каб пісаць добрыя старонкі традыцыйнага сяброўства, устаноўленага з часоў афіцыйнага візіту ў Беларусь Прэзідэнта Хо Шы Міна ў 1957 годзе», — падкрэсліў ён і выказаў спадзяванне на тое, што двухбаковыя адносіны будуць развівацца на карысць двух народаў.

**Вераніка КАНЮТА.**



Фота Сяргея ЧЫЧЫЛАВА.

Вялікае святочнае і ўрачыстае мерапрыемства штогод адзначаюць у другую нядзелю мая. Свята ўстаноўлена Указам Прэзідэнта № 157 ад 26 сакавіка 1998 года. Гэтым разам больш за пяць тысяч чалавек сабраліся на сталічнай плошчы Дзяржаўнага сцяга для таго, каб далучыцца да ўрачыстага рытуалу ўшанавання дзяржаўных сімвалаў Беларусі. У святочным мерапрыемстве ўзялі ўдзел Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, прадстаўнікі прадпрыемстваў, партый, моладзь. Далучылася і «Звязда».

### «АДНО З САМЫХ ВАЖНЫХ СВЯТ НАШАЙ КРАІНЫ»

Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца сімваламі нашай краіны як суверэннай дзяржавы. Кожная сучасная дзяржава мае свае сімвалы, якія выказваюць яе палітычную самастойнасць і незалежнасць. Дзяржаўныя сімвалы падкрэсліваюць нацыянальны дух і годнасць беларускіх грамадзян.

Старт урачыстаму мерапрыемству даў **Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН.** Ён павіншаваў суайчыннікаў з Днём Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна: «Хачу ўсіх павіншаваць з адным з самых важных свят нашай краіны. Усім нам жадаю міру, дабрабыту і працвітання любімай Беларусі».

Прэм'ер-міністр таксама агучыў зварот Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. «Выбар беларусаў, зроблены 30 гадоў таму, адзначыў урачыстасць гістарычнай справядлівасці і пачаў адлік мірнага стваральнага жыцця маладой краіны, — гаворыцца ў віншаванні кіраўніка дзяржавы. — Нацыянальныя сімвалы, увабраўшы ў сябе духоўную сілу народа, зберагаюць яго каштоўнасці і сэнсы, умацоўваюць адзінства і падштурхоўваюць на вялікія здзяйсненні. Поспехі цяперашняга пакалення — ад моцнай дзяржаўнасці да развітой эканомікі — заўсёды будуць азарацца прамянямі ўзыходзячага над зямным шарам сонца, валодаць чырвона-зялёным адлівам і гучаць у мелодыі гімна».

Дзяржаўныя сімвалы — гэта атрыбут незалежнасці Беларусі. Гэтым меркаваннем у гутарцы з журналістамі падзяліўся **намеснік Прэм'ер-міністра Уладзімір КАРАНІК:** «Дзяржаўныя сімвалы — гэта тое, што нас аб'ядноўвае. Гэта прыкмета дзяржаўнасці, атрыбут незалежнасці. Мы ў першую чаргу маладому пакаленню павінны прывіваць гонар за сваю краіну, за свае сімвалы, каб кожны раз яны імкнуліся праслвіць сваю краіну. Таксама гэта важна і для таго, каб мы назіралі нашы

АКЦЭНТЫ

# ТРЫУМВІРАТ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

## «Дзяржаўныя сцяг, герб, гімн — гонар краіны!»: эксперты — пра значэнне нацыянальных сімвалаў

У нядзелю, 11 мая, у Мінску на плошчы Дзяржаўнага сцяга прайшоў урачысты рытуал ушанавання дзяржаўных сімвалаў, прысвечаны святкаванню Дня Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. У мерапрыемстве прынялі ўдзел звыш 5 тысяч чалавек. Гэтае свята з'яўляецца яшчэ адным важным складнікам, які аб'ядноўвае беларускі народ. Эксперты расказалі аб сутнасці і закладзеных сэнсах мерапрыемства.



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ** падкрэслівае, што Дзень дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь — гэта дзень, калі беларусы асабліва адчуваюць адзінства з Радзімай:

— Герб, сцяг і гімн з'яўляюцца жывымі сімваламі нашай гісторыі, культуры, перамог і

# «ТОЕ, НА ШТО МЫ РАЎНЯЕМСЯ»

## У Беларусі адзначылі Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

дзяржаўныя сімвалы ўзнесенымі над міжнароднымі спартыўнымі арэнамі, каб яны асацыіраваліся з навуковымі дасягненнямі, дасягненнямі культуры, каб фактычна мы праслаўлялі сваю краіну на ўсіх узроўнях. Неабходна, каб дзяржсімвалы ў кожнага беларуса выклікалі гонар».

На такіх мерапрыемствах моладзь выяўляе зацікаўленасць. «Гэта сведчыць аб тым, што мы сталі больш звяртаць увагі на патрыятычнае выхаванне моладзі, а яна ў нас вельмі разумная, вельмі таленавітая», — падкрэсліў Уладзімір Каранік. — Моладзь зрабіла правільныя высновы і сваім удзелам галасуе за мір, стабільнасць і развіццё».

### «ТОЕ, ШТО РОБІЦЬ НАС БЕЛАРУСАМІ»

Дзяржаўная сімволіка — гэта тое, што робіць нас беларусамі, падзялілася **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС:** «30 гадоў таму мы на рэферэндуме прынялі найважнейшае рашэнне ў нашым жыцці. Рашэнне, якія дзяржаўныя сімвалы будуць суправаджаць нашу гісторыю і нашу дзяржаву. Гэта тыя сімвалы, якія мы ўшаноўваем сёння. Яны кажуць пра тое, што мы адзіны народ, што ў нас ёсць свая гісторыя, традыцыі, культура, што мы самабытныя і гатовыя жыць у міры і згодзе».

Колеры дзяржаўнага сцяга, сімволіка, замацаваная ў гербе, гімн — тое, што робіць нас беларусамі, падкрэсліла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта: «Гэта ўсё тое, што робіць нас накіраванымі ў будучыню. Тое, што мы можам перадаць сваім дзецям і можам ганарыцца нашымі дасягненнямі. Шчыра кажучы, усе нарматыўныя акты, якія апошнім часам мы прымаем, якія датычацца ідэалогіі і будучыні, адлюстроўваюць наша шчырае пачуццё любові да Радзімы, пачуццё патрыятызму, прыхільнасці нашай гісторыі і нашай самабытнасці. Гэта тое, на што мы раўняемся».

Згуртаванасць вакол дзяржсімвалаў дакazвае, што беларусы — маналітная нацыя, расказаў журналістам **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ:** «Ушанаванне дзяржаўных сімвалаў не толькі на дзяржаўным узроўні, але і ў сем'ях сведчыць пра ўздым патрыятызму, аб згуртаванні нацыі ў такі няпросты перыяд. Не будзем у гэты святочны дзень паўтараць пра пагрозы. Мы ўсе разумеем, што яны ёсць. І толькі згуртаванасць вакол нацыянальных сімвалаў, вакол нашага нацыянальнага лідара паказвае ворагам, што мы — адзіная, маналітная нацыя. Мы — адзіны, моцны, згуртаваны народ».

### «ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ ДАЮЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ АТАЯСАМЛІВАЦЬ НАШУ ДЗЯРЖАВУ НА МІЖНАРОДНЫМ УЗРОЎНІ І ГУРТАВАЦЬ НАШ НАРОД»

Як адзначыў **Старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр МІКЛАШЭВІЧ,** дзякуючы дзяржаўным сімвалам народ Беларусі становіцца больш згуртаваным: «Дзяржаўныя сімвалы даюць магчымасць атаясамліваць нашу дзяржаву на міжнародным узроўні і гуртаваць наш народ. Дзякуючы ім мы заўсёды адчуваем за сабой нашу вялікую Радзіму — Рэспубліку Беларусь. Мы ганарымся, што гэтае свята ў нас устаноўлена на дзяржаўным узроўні». Ён падкрэсліў, што беларусам неабходна шанаваць і беражліва захоўваць дзяржаўныя сімвалы.

Беларусы мацуюць сувязь пакаленняў, працягваюць традыцыі нашых продкаў, ганарацца сваёй гісторыяй. Ужо 30 гадоў дзяржаўныя сімвалы з'яўляюцца сімваламі спартыўных, творчых і працоўных перамог у гісторыі суверэннай Беларусі. Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь — сімвалы адзінства народа, якія мы абавязаны захоўваць, каб зберагчы сваю краіну.

У Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна ад імя маладога пакалення Беларусі клятву вернасці дзяржаўным сімвалам вымавілі прадстаўнікі моладзі з усіх рэгіёнаў краіны і горада Мінска. Маладыя людзі пакляліся быць годнымі грамадзянамі краіны, берагчы мір і спакой на беларускай зямлі, абараняць яе гэтак жа годна, як і нашы прадзеды ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

### «УРАЖАННЕ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ»

У рамках ушанавання дзяржаўных сімвалаў на вуліцах сталіцы разгарнулася вялікае палатно Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь даўжынёй 500 метраў, 9 метраў шырынёй і вагой больш за 400 кілаграмаў! Яго пранеслі па праспекце Пераможцаў прадстаўнікі рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Усе прыйшлі з адной мэтай: выказаць сваю пашану дзяржаўным сімвалам, якія ўвасабляюць нашу ідэнтычнасць.

Дарэчы, у шэсці з самым вялікім Дзяржаўным сцягам Беларусі ўзялі ўдзел не толькі нашы суайчыннікі, але і замежныя госці. Сярод іх — **сям'я Паўлавых** з Расіі. Маладыя людзі падзяліліся з журналістамі ўражаннямі. «Цалкам выпадкова трапілі на шэсце са сцягам. Ужо другі раз удзельнічаем у святкаванні Дня Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Першы раз былі ў 2022 годзе. Мы не ведалі, што ён святкуецца ў другую нядзелю мая, думалі, ёсць пэўная дата. Сёння мы разам з іншымі людзьмі неслі Дзяржаўны сцяг Беларусі. Гэта ўражанне на ўсё жыццё», — адзначыла Вера Паўлава. У мерапрыемстве яна ўдзельнічала разам з мужам і дачкой. Жанчына дадала, што іх сям'я два-тры разы на год прыязджае ў Беларусь, а ў яе мужа Мікалая фактычна ўся радня з нашай краіны.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

---

выпрабаванняў беларускага народа. Гэта дзяржаўнае свята — акт памяці і павагі да тых, хто стварыў нашу краіну, хто змагаўся за яе свабоду і незалежнасць. Герб, сцяг і гімн Рэспублікі Беларусь — трыумвірат нацыянальнай ідэнтычнасці, сімвалы ўсяляюць веру і надзею ў квітнеючую будучыню нашай краіны.



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей КЛІШЭВІЧ** распавёў у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё», як моладзь рэагуе на такія святы.

— Беларусь — параўнальна маладая дзяржава. Ёй крыху больш як 30 гадоў. Сёння мы знаходзімся на этапе фарміравання традыцый, умацавання нашых традыцыйных мерапрыемстваў, у тым ліку тых, якія пацвярджаюць нашу суверэннасць, незалежнасць. Ушанаванне нацыянальных сімвалаў — сцяга, герба, гімна — наўпрост уплывае на ўзмацненне нашай дзяржавы, на нармальнае, годнае жыццё беларусаў, — упэўнены парламентарый.

Ён растлумачыў, як гэта ўплывае на жыццё школьніка, студэнта, пенсіянера, працаўніка:

— Гэта суверэнітэт і незалежнасць, вызначэнне таго, што, калі мы сёння хочам накіроўваць столькі грошай на медыцыну — значыць, будзем накіроўваць. Калі мы хочам, каб у нас было 50 працэнтаў бюджэтных месцаў — значыць, будзе так. Калі мы хочам, каб дзіцячы садок быў бясплатны, а бацькі аплачвалі толькі сабекошт харчавання — значыць, так будзе, а не як у іншых дзяржавах. Калі мы хочам, каб адпачынак па доглядзе дзіцяці ў жанчын аплачваўся тры гады — будзе так. Кажучы простымі словамі, гэта і ёсць наш суверэнітэт і незалежнасць. Нашы нацыянальныя сімвалы гэта гарантуюць, пацвярджаюць, Беларусь выбірае такі шлях развіцця.

Дэпутат звярнуў увагу, што сярод удзельнікаў урачыстага мерапрыемства было вельмі шмат маладых людзей:

— Прычым менавіта ад моладзі сыходзіць ініцыятыва ў святкаванні гэтага дня ў нашай краіне. Адной з «фішак» стаў 500-метровы сцяг, які неслі маладыя людзі і вядомыя беларусы.

Ён нагадаў, што кожны год у свята з'яўляецца новая разынача:

— Гэта ўплывае на тое, каб мы як дзяржава маглі ўмацоўвацца. Бо 30 гадоў — зусім невялікі перыяд, у гэты час мы павінны сфарміраваць свае традыцыйныя каштоўнасці, замацаваць асаблівасці развіцця нашай дзяржавы. І гэта будзе тым падмуркам, на якім наступныя пакаленні змогуць будаваць суверэнную беларускую дзяржаву, развіваць яе так, як гэта неабходна будучым пакаленням.



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Наталля АЎСЯННІКАВА** падкрэсліла, што дзяржаўныя сцяг, герб, гімн — гонар краіны!

— Нашы сімвалы — гэта важныя атрыбуты дзяржаўнасці, якія сімвалізуюць незалежнасць краіны, стойкасць і вытрымку нашага народа, дасягненні і згуртаванасць нацыі, — акцэнтуе ўвагу дэпутат. — Як сказаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, мы «ганарымся сваімі сімваламі і айчыннай гісторыяй, глядзім у будучыню, памятаючы пра нашы вытокі. Гэта наш шлях, і ў гэтым наша сіла».

Парламентарый канстатуе: трыядзінства дзяржаўных сцяга, герба і гімна нясе ў сабе гістарычную пераемнасць паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй беларускай дзяржаўнасці:

— Менавіта ў такім спалучэнні яны павінны пастаянна прысутнічаць у нашым жыцці, натхняючы на мірную працу ў імя працвітання нашай Рэспублікі Беларусь.



З калегам-парламентарыем салідарная **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК:**

— Любоў да роднай зямлі, працавітасць, справядлівасць, імкненне жыць у міры і згодзе — усё гэта аб'ядноўвае беларусаў у вялікую дружную сям'ю. Мы шануем нашу гісторыю, беражом традыцыі продкаў, ганарымся дасягненнямі сучаснасці і шануем нашы дзяржаўныя сімвалы, у якіх адлюстравана моцная сувязь пакаленняў, галоўныя каштоўнасці, увасаблена свабода і незалежнасць нашай краіны.

# БЕЛАЕ ЗОЛАТА




## ТРЫ ЗАДАЧЫ

— У параўнанні з 2002 годам сярэдні надой павысіўся з 2345 да 6198 кілаграмаў (у 2024 годзе), — адзначае навуковец. — За апошнія 10 гадоў прадукцыйнасць кароў вырасла на 1658 кг. Колькасць сельскагаспадарчых арганізацый, якія за год атрымлівалі ад каровы па 7000 кг малака і больш, павялічылася з 16 у 2006 годзе да 314 у 2024-м (або на 1962,5 %). Звыш 11 000 кг малака надаілі ў мінулым годзе ў 23 гаспадарках.

***— Як дасягнулі такога росту?***

— Гэта комплекснае вырашэнне трох асноўных задач. Павышэнне генетычнага патэнцыялу і жыццяздольнасці жывёл адбываецца шляхам мэтанакіраванай селекцыі з выкарыстаннем найлепшых сусветных генетычных рэсурсаў і генетыка-папуляцыйных метадаў. Удасканальваюцца тэхналогіі нарыхтоўкі кармоў, адбываецца шырокае прымяненне найбольш прадукцыйных кармавых культур і, перш за ўсё, высокабялковых. А таксама ўдасканальваюцца тэхналогіі ўтрымання жывёл, адбываецца эканамічна абгрунтаванае, рэгіянальна адаптаванае атрыманне жывёлагадоўчай прадукцыі. Максімальная аддача магчыма толькі ў выпадку, калі ўсе гэтыя складнікі працуюць зладжана.

Беларусь сёння экспартуе малочнай прадукцыі ў год прыкладна на 8 млрд долараў, распавёў Уладзімір Цімашэнка:

— Наша краіна здолела захаваць пагалоўе буйной рагатай жывёлы і, што вельмі важна, мадэрнізаваць вытворчасць малака. Прычым мадэрнізацыя ішла паралельна са стварэннем уласнай галштынскай пароды, прызначанай для інтэнсіўных тэхналогій. Сёння людзі забываюць, што не так даўно — літаральна 30-35 гадоў таму — паліцы прадуктовых крам былі пустымі, а цяпер асартымент (у тым ліку малочнай прадукцыі, паколькі мы гаворым пра яе) вельмі шырокі. Нашы прамысловыя комплексы па аб'ёмна-планіровачных рашэннях, па тэхналогіях, па кіраванні сёння не адрозніваюцца ад комплексаў Заходняй Еўропы. Гэта пацвярджаюць замежныя калегі, навукоўцы і практыкі аграрнай сферы, наведваючы нашы малочныя комплексы.

## ПАСВІЦЬ ЦІ НЕ ПАСВІЦЬ?

Мегафермы і велізарныя комплексы дазваляюць максімальна аўтаматызаваць працэсы вытворчасці малочнай прадукцыі, знізіць выдаткі і атрымліваць высокія надоі. Але калі вясной выглядвае сонейка, а траўка зелянее, мімаволі задумваешся аб выпасным утрыманні кароў, бо так было спакон веку.

— Беларусь развівае інтэнсіўную малочную жывёлагадоўлю: гэта буйныя комплексы па 1000-1200 і больш кароў, — распавёў Уладзімір Цімашэнка. — Перш за ўсё, выпасваць такі статак немагчыма нават тэхнічна. Па-другое, каб даваць 5-7 тыс. кг малака ў год, карова павінна з'ядаць 20-22 кг сухога рэчыва корму ў дзень, прычым з пэўнай пажыўнасцю. На лузе такой колькасці сухога рэчыва жывёла проста не атрымае. І, па-трэцяе, для жвачных вельмі важны пастаянны від корму. Гэта чалавеку патрэбен разнастайны рацыён — карове ж для захавання стабільнага працэсу стрававання неабходны пастаянныя суадносіны мікраарганізмаў, прасцейшых, грыбкоў, якія жывуць у рубцы. Змяняецца склад корму — змяняецца папуляцыя мікраарганізмаў у страўніку каровы, а гэта прыводзіць да дрэннай засваяльнасці кармоў і іх нерацыянальнага выкарыстання. Пры выпасной жывёлагадоўлі забяспечыць стабільнасць у гэтым пытанні немагчыма.

***— Тым не менш некаторыя краіны, напрыклад Швейцарыя, знакамітая сваімі сырамі, захавалі выпасную малочную жывёлагадоўлю...***

— Выпасвае круглы год свае статкі таксама Новая Зеландыя, Аўстралія па ўзбярэжжы — то-бок, адбываецца гэта там, дзе лета круглы год. Па тым жа шляху пайшла Швейцарыя з яе альпійскімі лугамі. Але ў гэтых краінах пераважаюць маленькія фермы на 20-30 кароў. Надоі пры выпасной жывёлагадоўлі не надта вялікія, і ў той жа Швейцарыі 50 % выручкі фермераў — бюджэтныя субсідыі. Такім чынам, гэта не той шлях, па якім варта ісці нам пры нашай буйнамаштабнай вытворчасці, — заўважыў навуковец. — У нас няма Альп, няма горных лугоў, але ёсць сучасныя высокатэхналагічныя комплексы, і мы ўмеем з імі працаваць.

## КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД

На 1 студзеня ў Беларусі налічвалася каля 2,9 тысячы малочнатаварных ферм, з якіх 1,6 тысячы — сучасныя высокатэхналагічныя комплексы (56 %). Удзельная вага вытворчасці малака на комплексах складае 77 % ад агульнага аб'ёму вытворчасці. Прадукцыйнасць дойнага статка па іх за 2024 год склала 6739 кг, што на 541 кг вышэй за сярэднерэспубліканскі паказчык.

— У развіцці тэхналогій малочнай жывёлагадоўлі ў нашай краіне можна вызначыць два асноўныя кірункі. Першы звязаны са зніжэннем выдаткаў рэсурсаў, у першую чаргу працы і кармоў, на адзінку прадукцыі. Шырокае выкарыстанне рэсурсазберагальных тэхналогій утрымання і кармлення жывёл з даеннем у даільных залах або на рабатызаваных устаноўках з камп'ютарным кіраваннем дазволіла знізіць працавыдаткі на 1 ц малака з 9,5 да 1,2 чалавека-гадзіны, расход кармоў — з 1,3 да 0,9 кармавой адзінкі і наблізіцца да вытворчасці малака на аднаго работніка да 500 тон у год, што адпавядае ўзроўню інтэнсіфікацыі вытворчасці ў заходнееўрапейскіх краінах. Другі кірунак датычыцца комплекснай механізацыі асноўных тэхналагічных працэсаў: утрыманне жывёл ва ўмовах кантраляванага мікраклімату, эфектыўнае кормапрыгатаванне і кармленне, выдаленне і ўтылізацыя адходаў, даенне і астуджванне малака, заатэхнічны ўлік і кіраванне статкам з дапамогай аўтаматызаваных сістэм, — адзначае прафесар.

У найбліжэйшай будучыні ў Беларусі будуць створаны фермы з поўнай аўтаматызацыяй вытворчых працэсаў, паведаміў Уладзімір Цімашэнка. Будучыня малочнай галіны — пераўтварэнне малочнага комплексу ў гнуткую самаадаптаваную сістэму машын, параметры і рэжымы якіх увязаныя з прадукцыйнасцю жывёл.

## ДАКЛАДНЫЯ ПАРАМЕТРЫ

— Якасць малака — не абстрактнае паняцце. Яно вызначаецца складам, структурай і ўласцівасцямі кампанентаў, якія залежаць ад мноства заатэхнічных фактараў, — падкрэслівае навуковец. — У першую чаргу можна вылучыць пародныя асаблівасці жывёл. Пароды малочнага кірунку, напрыклад галштынская, адрозніваюцца здольнасцю да высокіх удояў, іншыя пароды, такія як джэрсі, айршыры, лічацца паляпшальнікамі па тлушчамалочнасці. Склад малака залежыць і ад рацыёну жывёл. Недахоп пажыўных рэчываў, незбалансаваныя суадносіны энергіі, бялкоў, клятчаткі, недахоп вітамінаў або мікраэлементаў пагаршаюць якасныя характарыстыкі малака. Тлустасць залежыць ад наяўнасці ў рацыёне крыніц якаснай клятчаткі, бялковы склад — ад балансу пратэіну. Запаленчыя працэсы ў малочнай залозе кароў могуць прыводзіць да павелічэння колькасці саматычных клетак у малацэ.

Дзяржаўным стандартам у нашай краіне пры прыёме на перапрацоўку малако падзяляюць на тры гатункі: экстра, вышэйшы і першы.

— Агульная колькасць мікраарганізмаў у малацэ вышэйшага і першага гатункаў дапускаецца ў межах, якія адпавядаюць еўрапейскай якасці, — адзначае Уладзімір Цімашэнка. — Але ў нашай краіне сёння каля 80 % малака здаецца сортам «экстра», а беларускія патрабаванні да яго якасці нават пераўзыходзяць патрабаванні Еўрасаюза. У гэтым наша перавага, і таму беларуская «малочка» запатрабавана ў дзясятках краін свету.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

СЕЗОННЫ КЛОПАТ

# 80 НОВЫХ КАМБАЙНАЎ АДПРАВІЛІСЯ

**Каб бітвы былі толькі за ўраджай**

Напярэдадні свята Вялікай Перамогі 80 сучасных энерганасычаных збожжаўборачных камбайнаў айчыннага вытворцы былі перададзены гаспадаркам Міншчыны. Гэта сапраўды добры падарунак для аграрыяў рэгіёна, якія змагаюцца за ўраджай, забяспечваючы харчовую бяспеку нашай краіны. Ва ўрачыстай цырымоніі перадачы новых камбайнаў узялі ўдзел старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА і генеральны дырэктар ААТ «Гомсельмаш» Аляксандр НОВІКАЎ. «Звязда» далучылася да святочнага мерапрыемства і даведалася аператыўную інфармацыю з сяўбы.

## «НАША ЗАДАЧА — ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ ХАРЧОВУЮ БЯСПЕКУ І МОЦНУЮ ЭКАНОМІКУ»

«Напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі мы перадаём сучасныя беларускія камбайны ў сельскагаспадарчыя арганізацыі Мінскай вобласці, — звяртаючыся да аграрыяў, заявіў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей Кушнарэнка. — Кожны камбайн упрыгожаны Сцягам Перамогі, які служыць напамінам, што сёння мы вядзём бітвы толькі за ўраджай, выпускаючы на палі мірную тэхніку, працуючы на сваёй зямлі і забяспечваючы харчовую бяспеку нашай краіны».

Кіраўнік вобласці падкрэсліў, што 2024 год стаў знакавым для цэнтральнага рэгіёна: «Кожнае чацвёртае беларускае зярнятка было сабрана на палях Міншчыны. Нясвіжскі, Мінскі і Слуцкі раёны пераадолелі 200-тысячную планку, стаўшы рэкардсменамі краіны, а камбайнеры Дзяржыншчыны на айчыннай тэхніцы намалацілі звыш 6 тысяч тон збожжа. Іх прыклад — гэта мірны подзвіг, годны памяці гераічных продкаў».

Паводле слоў губернатара, стварэнне дастойных умоў працы, прыцягненне моладзі і рост даходаў з'яўляюцца першараднымі задачамі для развіцця аграпрамысловага комплексу Міншчыны: «Сённяшняя акцыя — чарговы крок у іх вырашэнні. Мы і далей будзем пастаўляць сучасную тэхніку ў гаспадаркі рэгіёна. Тэхнічнае пераўзбраенне разам з заработнай платай работнікаў сельскай гаспадаркі вобласці (дарэчы, яна складае ўжо больш за дзве тысячы рублёў) дазваляе з упэўненасцю глядзець у будучыню і разумець, што задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам нашай краіны, будуць выконвацца».

Ветэраны абаранілі нашу незалежнасць падчас вайны. А наша задача — забяспечваць харчовую бяспеку і моцную эканоміку для таго, каб мірнае неба заўсёды было над нашымі галовамі, адзначыў у размове з журналістамі Аляксей Кушнарэнка. «Аграрыі Міншчыны разумеюць гэту задачу і зробяць усё для таго, каб яе выканаць», — запэўніў ён.

## КАМБАЙНЫ СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ!

Ад машынабудаўнікоў краіны і 14-тысячнага калектыву ААТ «Гомсельмаш» аграрыяў цэнтральнага рэгіёна вітаў генеральны дырэктар прадпрыемства Аляксандр Новікаў: «Штогадовая перадача тэхнікі холдынга аграрыям Мінскай вобласці стала ўжо добрай традыцыяй. Перадача 80 камбайнаў «Гомсельмаша» сімвалічная, бо яна праходзіць у дні святкавання 80-годдзя Вялікай Перамогі. Жадаю вам добрых ураджаяў, каб наша тэхніка не падводзіла вас у палях, моцнага здароўя і мірнага неба над галавой», — сказаў Аляксандр Новікаў.

Пасля ўрачыстай цырымоніі кіраўнік найбуйнейшага прадпрыемства краіны расказаў журналістам, у якіх умовах будуць працаваць аграрыі, што пераселі на новыя камбайны: «Ужо з мінулага года мы пачалі абсталёўваць усе мадэлі тэхнікі сучаснай кабінай UNI CAB. Яна больш зручная і камфортная. У кабіне ўстаноўлены кандыцыянер, ёсць і іншыя опцыі — зручнасць кіравання камбайнам, зручнае сядзенне з падагрэвам, пнеўмападушка. Таксама ў камбайн устанавілі халадзільнік, каб механізатар мог у гарачую пару папіць прахалоднай вады».

Сярод тых, хто таксама атрымаў новы камбайн, — **механізатар ААТ «Скабін» Капыльскага раёна Андрэй ВОЛКАЎ**. Ён каля 20 гадоў працуе ў гаспадарцы, правёў больш за 15 уборачных. Апошнія сем гадоў працуе ў пары са сваёй жонкай Таццянай. Яна — памочнік камбайнера. Дарэчы, бацька яго, таксама працаваў механізатарам. «16 гадоў адпрацаваў на адным камбайне, і вось цяпер перасаджваюся на новенькі!» — падзяліўся аграрый.

ТУРЫЗМ

# ЛЕТА Ў ВЁСЦЫ

## Конныя прагулкі, дэгустацыі, начлег на адрыне — што прапануюць аграэкасядзібы?



Май у Беларусі названы месяцам аграэкатурызму. Гэты від развіваецца з 2006 года і з'яўляецца вельмі запатрабаваным. У Беларусі дзейнічае больш за 1400 аграэкасядзіб. Найбольшая іх колькасць знаходзіцца ў Мінскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, якія прапаноўваюць адпачынак на прыродзе з рознымі элементамі сельскага каларыту.

У маі запланавана шырокая праграма мерапрыемстваў, якая пазнаёміць з асаблівасцямі адпачынку ў вёсцы. Сярод іх — дні адчыненых дзвярэй на аграэкасядзібах, раённыя агляды-конкурсы на найлепшую аграсядзібу і ўзнагароджанне лаўрэатаў, а таксама інфармацыйныя сустрэчы для абмеркавання актуальных пытанняў развіцця, абмену вопытам паміж прафесіяналамі галіны, анонсы новых праектаў і ініцыятыў.

### ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ І АТРЫМАЦЬ ДЗЯРЖПАДТРЫМКУ

— Аграэкасядзібы з'яўляюцца ўнікальным па сваёй сутнасці праектам, таму што гэта магчымасць пазнаёміцца з нацыянальнымі традыцыямі, прасякнуцца сельскім побытам і, вядома ж, адпачыць, — адзначае **кансультант Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Аляксандр КРЭЧАТАЎ**.

Зарэгістраваць такі від дзейнасці даволі проста.

— Спачатку дастаткова падаць заяву ў раённы выканаўчы камітэт, пасля чаго камісія выязджае і ацэньвае аграэкасядзібу на адпаведнасць патрабаванням заканадаўства. Для гэтага дастаткова жылога дома ў сельскай мясцовасці з поўнай колькасцю жылых пакояў (іх павінна быць не больш за 10) і зямельнага ўчастка поўнага мэтавага прызначэння. Акрамя таго, павінны быць умовы для заняткаў асабістай падсобнай гаспадаркай і азнаямлення наведвальнікаў з прыроднымі і іншымі аб'ектамі сельскай мясцовасці. Калі ўсе гэтыя патрабаванні выконваюцца, рыхтуецца адпаведнае рашэнне камісіі, — праінфармаваў Аляксандр Крэчатаў.

Пра цікавасць да аграэкатурызму сведчыць перш за ўсё статыстыка: летась аграэкасядзібы наведала больш за 427 тысяч чалавек, пераважная большасць з іх — беларусы. Аднак ёсць і вялікая колькасць замежных грамадзян. Напрыклад, вялікую цікавасць такія падарожжы выклікаюць у замежных студэнтаў і магістрантаў, у прыватнасці кітайскіх, якія жывуць і вучацца ў Беларусі. На выхадных яны нярэдка адпраўляюцца ў такія падарожжы, каб адчуць каларыт беларускай вёскі.





Аграэкасядзібы працуюць з падтрымкай дзяржавы. Як паведаміў Аляксандр Крэчатаў, больш за 340 суб'ектаў карыстаюцца зборам замест падатку на прафесійны даход, а крэдытная падтрымка летась склала больш за 500 тысяч рублёў. Кансультант нагадаў, што льготнае крэдытаванне гэтага віду дзейнасці ажыццяўляецца пад 5 % гадавых з адтэрміноўкай плацяжу для юрыдычных асоб на пяць гадоў, а фізічных — на сем. Праграма крэдытавання дзейнічае і сёлета, і ахвотныя адкрыць аграэкасядзібу могуць скарыстацца адпаведнымі паслугамі.

### ПАГЛЯДЗЕЦЬ ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ

У маі беларускія аграэкасядзібы праводзяць дні адчыненых дзвярэй для турыстаў. Паводле слоў **дырэктара Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрыя МАРОЗАВА**, яны актыўна звяртаюцца да такога фармату, каб пазнаёміць гасцей са сваімі магчымасцямі.

— Аграэкатурызм — адзін з найбольш вядомых брэндаў нашай краіны. Можа, колькасць нумарнога фонду ў аграсядзібах не такая вялікая, як у іншых відах турызму, але гэта найлепшы спосаб прасякнуцца каларытам розных рэгіёнаў. Аграэкатурызм цесна пераплятаецца з гастранамічным турызмам. Як правіла, менавіта ў аграсядзібах можна пакаштаваць стравы рэгіянальнай нацыянальнай кухні. Яны таксама з'яўляюцца пунктамі для арганізацыі мясцовых экскурсій. Гэта тыя аб'екты, дзе вельмі цэняцца звесткі мясцовых краязнаўцаў, — адзначыў Дзмітрый Марозаў.

Аграсядзібы традыцыйна актыўна ўдзельнічаюць у акцыі «Вандруй. Адчуй. Натхняйся», якая, дарэчы, стартуе ў першы тыдзень чэрвеня. Як правіла, яны прапануюць агляднія экскурсіі па тэрыторыі, скідкі на паслугі, напрыклад на катанне верхам на кані або кулінарны майстар-клас. Дарэчы, некаторыя мерапрыемствы ў рамках акцыі праходзяць апрабацыю і потым становяцца вядомым турыстычным прадуктам, уключаючыся ў туры па Беларусі. Напрыклад, начная экскурсія па былым дамініканскім манастыры ў Навагрудку.

Яшчэ адно значнае мерапрыемства для папулярызацыі адпачынку ў вёсцы — конкурс «Пазнай Беларусь». Намінацыя ў сферы аграэкатурызму — адна з папулярных.

— Улічваючы спецыфіку Года добраўпарадкавання і 80-годдзя Вялікай Перамогі, удзяляецца ўвага і таму, як тэматыка Вялікай Айчыннай вайны адлюстравана ў праграмах сядзібы, як адбываецца ўзаемадзеянне з рэгіянальнымі музеямі па гэтай тэме, што цікавага ў плане добраўпарадкавання тэрыторый рэалізавана, — падкрэсліў Дзмітрый Марозаў.

### ПРАГРАМЫ НА ЎСЕ ЎЗРОСТЫ

Акрамя аказання паслуг пражывання і харчавання аграсядзібы праводзяць вялікую колькасць мерапрыемстваў, арганізоўваюць майстар-класы, удзельнічаюць у сацыяльных праектах. Напрыклад, майстар-клас па адпампоўванні мёду прапаноўваюць сваім наведвальнікам на аргасядзібе «У хутарской цішы». Тут можна пакаштаваць як прадукты пчалярства, травяную гарбату, так і стравы нацыянальнай кухні. А вось аграсядзіба «Квітнеючыя берагі» ладзіць розныя майстар-класы для дзяцей, у прыватнасці папулярнасцю карыстаюцца ўрокі па этыкеце і сервіроўцы стала. Тут рэалізоўваецца некалькі сацыяльных праектаў, у тым ліку для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, якія з'яўляюцца частымі гасцямі аграсядзібы. Праграмы як для дзяцей, так і для пажылых турыстаў прапаноўваюць на аграсядзібе «Вецер у грывах». Гэта конныя прагулкі, у тым ліку і ў экіпажах, і начлег як у бабулінай вёсцы ў дзяцінстве — на адрыне. Нядаўнімі ўдзельнікамі такога мерапрыемства сталі менавіта пажылыя людзі, самаму малодшаму з іх было 73 гады, а самаму старэйшаму — 86. І гэта толькі пацвярджае высновy, што для аграэкатурызму ўсе ўзросты прыдатныя.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Ў ГАСПАДАРКІ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ



### «БУДЗЕМ З ХЛЕБАМ!»

Паводле слоў механізатара, яго самы вялікі рэкорд па намалоце — 1900 тон: «Хацелася б больш, але наша гаспадарка не самая буйная, таму асабліва не разгонішся. Але калі я атрымліваю новы камбайн — значыць, павінны быць і новыя дасягненні. Буду старацца, галоўнае, каб надвор'е не падвяло. А ўсё астатняе забяспечым — будзем з хлебам!»

Тое, што краіна будзе забяспечана хлебам, пацвердзіў і **першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Васіль СЫСОЕЎ**. Паводле яго слоў, вясенне-палявыя работы на Міншчыне падыходзяць да свайго завяршэння: «Ужо завершана сяўба цукровых буракоў, лёну, кукурузы на зерне. Што датычыцца яравых збожжавых, мы скончылі іх сеяць яшчэ ў мінулым месяцы.



Сёння працуем над сяўбой кукурузы: засталося пасеяць 10 %. У найбліжэйшыя некалькі дзён асноўны план будзе выкананы. Таксама вядзецца сяўба аднагадовай групы на кармавыя мэты. Работа будзе працягвацца, думаю, да канца мая, бо травы высейваюцца хвалямі: спачатку першая, затым другая. Гэта робіцца, каб не было адначасовага паспявання».

Паводле яго слоў, халоднае вясновае надвор'е ўнесла свае карэктывы, нашкодзіла пасевам: «Ёсць пытанні, звязаныя з гібеллю. Замаразкі нанеслі пэўны ўрон, які мы ацэньваем прыкладна ў 16 тысяч гектараў. Першая хваля замаразкаў прыпала літаральна на канец красавіка — пачатак мая. Пасля будзе вызначана канчаткова, што і ў якіх аб'ёмах трэба перасяваць. У асноўным перасяваць будзем кукурузу, гэта работа вядзецца поўным ходам, пасевы абследуюцца кожны дзень».

Таксама на парадку дня — падрыхтоўка да ўборкі збожжавых. «Яна актыўна вядзецца, паркі сельгаспрадпрыемстваў напярэдадні Дня Перамогі папоўніліся новай тэхнікай. І з наступнага тыдня, думаю, пачнецца нарыхтоўка траў першага ўкосу», — паведаміў Васіль Сысоеў.

Па тэмпах сяўбы той жа самай кукурузы Мінская вобласць займае першае месца ў краіне, прычым і па штодзённых, і па агульных тэмпах. «І мы не саступім лідарства, — падкрэсліў першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама. — Мы першымі закрыем план сяўбы. Сёння для нас зерне кукурузы — прадукт стратэгічны. Намалот у 842 тысячы тон у мінулым годзе ў бункернай вазе быў невыпадковы. І мы ні ў якім разе не плануем зніжаць планку. Гэта дае вынік у тым ліку па жывёлагадоўлі. Мы бачым павелічэнне вытворчасці малака».

Васіль Сысоеў канстатаваў, што пасяўная выйшла на фінішную рысу: «Мы яе практычна завяршаем. Адпраўка кормаўборачнай тэхнікі ў гаспадаркі вобласці вельмі своечасовая. Мы пачынаем працаваць з першым укосам, ужо закупілі ўгнаенні для падкормкі траў пасля першага ўкосу. Асноўную задачу бачым у знясці двух укосаў да пачатку масавых уборачных работ і росце аб'ёму нарыхтоўкі сенажу ў вобласці ў мэтах павелічэння аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Але за ўсім гэтым стаіць напружаная работа нашых механізатараў. Мне хочацца іх павіншаваць з надыходзячым святам. Глыбока сімвалічна, паколькі і лічба, і месца, і час правядзення, і аб'ём тэхнікі, які паступае, — для Мінскай вобласці зоркі сышліся».

Дарэчы, Міншчына мэтанакіравана апошнія некалькі гадоў працуе ў частцы абнаўлення машынна-трактарнага парка і насычэння яе менавіта новымі высокаэфектыўнымі энергетычнымі машынамі. «Такая тэхніка дае выпрацоўку, непараўнальную з тымі машынамі і трактарамі, якія былі ў нас раней, у выніку чаго прадукцыйнасць павялічваецца ў 3-4 разы, а адзін і той жа механізатар практычна замяняе нам 2-3 чалавекі. Работу ў гэтым кірунку мы працягнем у далейшым», — падагуліў першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама.

Усяго па аператыўнай інфармацыі аграрыі Міншчыны пасеялі звыш 450 тысяч гектараў яравых культур, 245 тысяч гектараў кукурузы.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ

# ПАДТРЫМКА СЯМ'І — НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРЫЯРЫТЭТ

## У Беларусі стартавала акцыя «Разам — за моцную і здаровую сям'ю»



Мерапрыемствы пройдуць з 12 да 17 мая і будуць прысвечаны Міжнароднаму дню сям'і, які адзначаецца 15 мая. Ужо сёння, 13 мая, адбудзецца міжнародны форум «Сям'я — аснова дэмаграфічнага патэнцыялу дзяржавы» і адзіны дзень кансультавання па пытаннях сям'і. А 15 мая пройдзе фінал конкурсу маладых сем'яў ваеннаслужачых «Сям'я — крышталь грамадства» і фотачэлендж «Сям'я — гэта...». У Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага ў Мінску 17 мая адбудзецца рэспубліканскае сямейнае свята з канцэртамі і актыўнасцямі.

### БЯСПЛАТНЫЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ, ДНІ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ, ФЕСТЫВАЛІ

Шэраг падзей чакаецца гэтымі днямі і ў рэгіёнах: ушанаўванне залатых і сярэбраных юбіляраў сямейнага жыцця, спартландыя «Сям'я на старце» для сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, выставы творчых работ «Маці, бабуля і я — рукадзельная сям'я», для шматдзетных сем'яў — дні адчыненых дзвярэй у музеях. У школах пройдуць урокі аб сямейных каштоўнасцях і конкурсы сачыненняў. У ВНУ — маладзёжныя форумы аб сучаснай сям'і, а ў паліклініках — кансультацыі па рэпрадуктыўным здароўі.

Свае ініцыятывы прадставяць і грамадскія арганізацыі. Гэта праект «Тата-зала» для ўмацавання бацькоўскай ролі ў сям'і, фестываль шматдзетных сем'яў і конкурс «Уладар вёскі», рэлігійныя форумы ў падтрымку традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена падтрымцы шматдзетных сем'яў і сем'яў з дзецьмі-інвалідамі. У межах акцыі пройдуць бясплатныя юрыдычныя кансультацыі і дабрачынныя мерапрыемствы.

— Сям'я — той падмурак, на якім фарміруецца будучыня нашай краіны. Сям'я выступае ў аснове развіцця і захавання нацыі, што неаднаразова падкрэсліваў кіраўнік нашай дзяржавы. Ва ўмовах сучаснага свету, дзе мы сутыкаемся з рознымі выклікамі і змяненнямі, асабліва важна захоўваць традыцыйныя сямейныя каштоўнасці і духоўна-маральныя арыенціры. Павага і спагада, клопат і адказнасць, салідарнасць, патрыятызм, гістарычная памяць служаць асновай для пабудовы моцнай сям'і, выхавання шчаслівых дзяцей, фарміравання здаровага ва ўсіх сэнсах грамадства, — адзначыла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Юлія БЕРДНІКАВА,** звярнуўшы ўвагу, што падтрымка сям'і з'яўляецца нацыянальным прыярытэтам.

### МАТЭРЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА І ВЫРАШЭННЕ ЖЫЛЛЁВЫХ ПЫТАННЯЎ

У нашай краіне з пачатку яе незалежнай гісторыі вызначаны асноўныя кірункі дзяржаўнай сямейнай палітыкі, і яны дагэтуль не губляюць актуальнасці. Найперш гэта паляпшэнне сацыяльна-эканамічных умоў. У Беларусі забяспечана матэрыяльная падтрымка сям'і пры нараджэнні і выхаванні дзяцей, дапамога ў вырашэнні жыллёвых пытанняў, у тым ліку маладым і шматдзетным сем'ям, развіваецца інфраструктура дзіцячых адукацыйных і медыцынскіх устаноў, пашыраюцца магчымасці для культурнага развіцця і сямейнага адпачынку.

Юлія Бердлікава адзначыла навацыі апошніх пяці гадоў, якія былі рэалізаваны ў нашым заканадаўстве. Сярод найбольш знакавых — права на датэрміновае выкарыстанне сродкаў сямейнага капіталу, якое дадзена з 2020 года, што дазволіла многім шматдзетным сем'ям палепшыць свае жыллёвыя ўмовы, а тым, хто не меў у гэтым патрэбы, інвеставаць у адукацыю і здароўе сям'і. Сёння ў Беларусі адкрыта амаль 146 тысяч дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал». Пры гэтым прынята больш за 92 тысячы рашэнняў аб датэрміновым выкарыстанні гэтых сродкаў. Каля 81 % з іх накіравана на вырашэнне жыллёвых пытанняў, 11 — на медыцынскія паслугі, 8 % — на адукацыю.

Істотна пашыраны за апошнія пяць гадоў і сацыяльныя гарантыі для сем'яў, якія выхоўваюць дзіця-інваліда. Узмоцнена падтрымка шматдзетных сем'яў, для іх уведзена магчымасць атрымання штомесячнай адраснай сацыяльнай дапамогі, пашыраны пенсіённыя гарантыі шматдзетным сем'ям. Напрыклад, павялічаны з 9 да 12 гадоў перыяд догляду дзіцяці да трох гадоў, які ўключаецца ў агульны стаж работы пры вызначэнні права жанчыны на пенсію па ўзросце.

Карыстаюцца ўсім спектрам дзяржаўнай падтрымкі і маладыя сем'і, дзе муж і жонка з'яўляюцца навучэнцамі ці студэнтамі навучальных устаноў. Такіх сем'яў у Беларусі, па інфармацыі **галоўнага спецыяліста ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алены ВАЙЦЯХОВІЧ,** каля 270. Акрамя гарантаванай падтрымкі маладым сем'ям яны маюць і шэраг іншых гарантый: выдзяленне месца ў інтэрнаце, матэрыяльная падтрымка, аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне, а таксама гнуткія формы атрымання адукацыі. Дапамагаюць такім сем'ям і пры аддаванні дзяцей у дзіцячыя садкі.

Апошнім часам прыносіць свой плён работа сістэмы адукацыі над сямейным недабрабытам і ранні выяўленнем сітуацый, калі сям'я мае патрэбу ў дапамозе. Па выніках 2024 года такая работа вялася з 22 тысячамі дзяцей з 10 700 сем'яў. Пры гэтым неспрыяльныя для дзяцей умовы ў сям'і найчасцей усё ж устараняюцца. Напрыклад, летась 78 % дзяцей зняты з уліку ў сувязі з нармалізацыяй сітуацыі ў сям'і пасля аказання ім дапамогі. Штогод каля паловы дзяцей, якія прызнаны маючымі патрэбу ў дзяржаўнай абароне і адабраны ў бацькоў, вяртаюцца на выхаванне ў свае сем'і.



Выдаткі на выплату дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, у 2024 годзе склалі**

3 380 млн рублёў +10,9% (да 2023 года)

Выдаткі на выплату дзяржаўных дапамог па мацярынстве ў 2024 годзе склалі**

277,4 млн рублёў + 7,3% (да 2023 года)

** Паводле даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь



Колькасць маладых і шматдзетных сем'яў, якія атрымалі жыллё і палепшылі жыллёвыя ўмовы (на канец 2024 года)

5 635 маладых сем'яў

7 765 шматдзетных сем'яў



У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ ПРАЖЫВАЕ (паводле даных перапісу насельніцтва 2019 года)

2 612 413 сем'яў

з іх

у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу 78,2%

у сельскіх населеных пунктах 21,8%

ад агульнай колькасці сем'яў

### ФОРМУЛА ЗДАРОЎЯ МАЦІ І ДЗІЦЯЦІ

Немалаважны аспект — захаванне здароўя сям'і. Гэтаму садзейнічаюць высокакваліфікаваныя медыцынскія кадры, якія працуюць у службе аховы здароўя мацярынства і дзяцінства, сучасныя тэхналогіі і практыкі, а таксама комплексная падтрымка як маці, так і нованароджаных. Яна адыгрывае вырашальную ролю не толькі ў ахове здароўя, але і ў дэмаграфічнай устойлівасці.

Як адзначыў **намеснік дырэктара РНПЦ «Маці і дзіця» Іван КУРЛОВІЧ,** сярод медыцынскіх складнікаў павышэння нараджальнасці — правядзенне бясплатнай пробы ЭКА, якая ў апошнія гады прапаноўваецца ў нашай краіне. Толькі летась было выканана 1522 поўныя цыклы лячэння бясплоддзя, у выніку чаго наступіла 576 цяжарнасцяў. Эфектыўнасць бясплатнага ЭКА ў апошнія гады складае ад 38 да 42 %, што з'яўляецца высокім паказчыкам. Расходы рэспубліканскага бюджэту на такое лячэнне склалі больш за 5,9 мільёна рублёў. Як паведаміў Іван Курловіч, у цяперашні час Міністэрства аховы здароўя падрыхтавала і накіравала ў Палату прадстаўнікоў прапановы аб выкананні другой бясплатнай пробы ЭКА.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Крыніца інфаграфікі Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь**

СУАЙЧЫННІКІ

# ПЯЦЁРА СЭРЦАЎ Б'ЮЦЦА РАЗАМ

## Сям'я — гэта самая вялікая ўзнагарода ў жыцці

— Наша мамачка самая мілая, уважлівая, працавітая... Яна самая лепшая на свеце! — кажа дзесяцігадовы Даніл.

— У мамачкі самыя добрыя вочы і самая прыгожая ўсмешка, — далучаецца да размовы яго брацік Раман, якому споўнілася шэсць гадоў.

— Мама самая лепшая, а тата самы надзейны! — шчабеча малодшая дачушка Ганначка.

З цікавасцю слухаю сваіх суразмоўцаў і не магу стрымаць замілаванасці. У шматдзетнай сям'і Чуб, якая жыве ў Лепелі Віцебскай вобласці, выхоўваецца трое цудоўных дзетак. Старэйшы, Даніл, сёлета заканчвае чацвёрты клас гімназіі імя І. Ерашова. Данік старанна вучыцца, дапамагае матулі ва ўсіх хатніх справах і ва ўсім бярэ прыклад з таты. Раман таксама расце паслухмяным і самастойным хлопчыкам. Сёлета ён пойдзе ў першы клас. А вось пяцігадовая Ганначка наведвае дзіцячы сад № 8.

— Сям'я для нас з мужам — неацэнны скарб, самая вялікая ўзнагарода ў жыцці, — шчыра прызнаецца Юлія Вітальеўна. — Я лічу сябе шчаслівым чалавекам, таму што са мной заўсёды побач родныя і блізкія людзі. Ва ўсім адчуваю клопат і падтрымку мужа. Дзеці ж напаўняюць наша жыццё асаблівай радасцю.

У кастрычніку 2021 года маладая сям'я пераехала ва ўласную добраўпарадкаваную двухпакаёвую кватэру ў новым доме па вуліцы Школьнай. Умелыя гаспадары стварылі тут утульнасць, кожны з пакояў абсталяваны з густам.

Пра фінансавы дабрабыт клапоціцца галава сям'і. Андрэй Віктаравіч працуе машыністам у лакаматыўным дэпо імя Заслонава.

Выхадныя дні вялікая і дружная сям'я з задавальненнем праводзіць на дачы ў вёсцы Вілы Лепельскага раёна. Каля дома на беразе ракі бацькі гатуюць шашлык, смажаць гародніну, а дзеці ў гэты час гуляюць у футбол або забаўляюцца ў пясочніцы, на спецыяльна ўладкаванай пляцоўцы. Працуюць маладыя гаспадары і на агародзе каля ўласнага дома ў Лепелі. Менавіта тут сям'я жыла да атрымання статусу шматдзетнай.

Шмат увагі маладыя муж і жонка ўдзяляюць уладкаванню кватэры: разам наведваюць гандлёвыя цэнтры, магазіны, каб набыць новую мэблю і бытавую тэхніку.

— Калі ў мяне з'явілася якая-небудзь ідэя, у першую чаргу раюся з мужам, — кажа Юлія Вітальеўна. — Вельмі важна, што ён выконвае ўсе мае просьбы, ва ўсім імкнецца падтрымаць. Лічу, што гэта ў сям'і самае галоўнае.



Выдатная гаспадыня, Юлія Вітальеўна не толькі клапоціцца пра тое, каб у доме былі чысціня і парадак, але і з задавальненнем гатуе для сваіх родных апетытныя стравы. Тарты, блінцы, пельмені, клёцкі, зразы... Усё атрымліваецца вельмі смачным, таму што гатуецца з душой.

— Для мяне вельмі важна, каб на стале не было паўфабрыкатаў. Усе стравы гатую сама, — адзначае гаспадыня.

Юлія Вітальеўна з цеплынёй расказвае пра сваіх дзетак, пра тое, як цікава і насычана сям'я праводзіць выхадныя...

Усе шчаслівыя сем'і падобныя паміж сабой, але ў кожнай з іх ёсць свая, непаўторная гісторыя.

### РАЗУМЕЛІ АДНО АДНАГО З ПАЎСЛОВА

Знаёмства Андрэя і Юліі адбылося ў 2010 годзе. Юная прыгажуня, якая вырасла ў аграгарадку Слабада Лепельскага раёна, стала навучэнкай Лепельскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя па спецыяльнасці «Цырульнік, швачка і садавод-агароднік».

— Мы перапісваліся са сваім знаёмым у сацыяльных сетках. І вось ён прыйшоў да мяне ў госці з сябрам. Гэта быў Андрэй. Мы з ім сустрэліся позіркамі — і ўжо, напэўна, тады зразумелі, што адчуваем сімпатыю адно да аднаго.

Хутка сустрэча маладых паўтарылася, але Андрэй прыехаў да Юліі адзін. Паступова хлопец і дзяўчына зразумелі, што іх аб'ядноўвае светлае ўзаемнае пачуццё.

— Ужо ў першыя дні нашага знаёмства я адчуў, што Юлія — менавіта тая дзяўчына, з якой мне хацелася б звязаць сваё жыццё, стварыць сям'ю і выхоўваць дзяцей. Уразілі яе душэўная цеплыня, шчырасць і адкрытасць. Мы разумелі адно аднаго з паўслова. Гэта і цяпер з'яўляецца галоўным у нашай сям'і, — расказвае муж.

Праз паўтара гады Андрэй зрабіў Юліі прапанову рукі і сэрца. Карэнны лепяльчанін, хлопец працаваў памочнікам машыніста ў лакаматыўным дэпо імя Заслонава. У 2012 годзе Андрэй вырашыў павысіць сваю кваліфікацыю і атрымаць спецыяльнасць машыніста ў Гомельскім дзяржаўным каледжы транспарту і транспартных камунікацый. Паколькі хлопцу для праходжання вучобы прыйшлося пакінуць родны горад, ён прапанаваў сваёй каханай дзяўчыне жыць у яго бацькоў.

Будучы муж атрымаў жаданую спецыяльнасць і вярнуўся працаваць у родны горад. І вось у 2013 годзе Андрэй і Юлія сталі мужам і жонкай. У 2015 годзе ў маладой сям'і нарадзіўся першы сыночак Даніл, праз тры гады — Раман, а ў 2020 годзе — дачка Ганначка.

Праходзячы па ўтульных пакоях кватэры маладой сям'і, я адчуваю асаблівую цеплыню, якой напоўнены кожны куточак. Дзякуючы ўвазе і клопату, створана атмасфера камфорту.

### ДАПАМОГА ВА ЎСІМ

Як адзначаюць бацькі, вялікае значэнне мае тое, што ў нашай краіне аказваецца значная падтрымка шматдзетным сем'ям з боку дзяржавы. Дапамога бацькам вядзецца практычна ва ўсіх галінах.

— Першы ўзнос пры будаўніцтве кватэры мы зрабілі за кошт мацярынскага капіталу, а потым атрымалі льготны крэдыт. Кожны месяц плацім сімвалічную суму — усяго 60 рублёў, — расказвае матуля. — Наш сын Даніл бясплатна харчуецца ў гімназіі. На харчаванне сына і дачкі ў дзіцячым садку прадугледжана 50-працэнтная зніжка. Мы як шматдзетныя бацькі скарысталіся магчымасцю бясплатна прайсці лячэнне ў стаматолага ў дзяржаўных медыцынскіх установах. Акрамя таго, мы вызвалены ад аплаты падаткаў за карыстанне зямельнымі ўчасткамі.

За ўсебаковую падтрымку і дапамогу шматдзетным сем'ям хочацца выказаць шчырыя словы падзякі Прэзідэнту нашай краіны Аляксандру Лукашэнку. Клапоцячыся пра шматдзетныя сем'і, дзяржава стварае надзейную будучыню краіны.

— На чым будуецца моцная і шчаслівая сям'я? — пытаюся ў мужа і жонкі.

— На ўзаемаразуменні, павазе, уменні чуць і, вядома ж, каханні, — адказваюць сужэнцы.

Андрэй Віктаравіч і Юлія Вітальеўна глядзяць адно на аднаго — і іх вочы свецяцца шчасцем і каханнем. Радасныя дзеткі абдымаюць сваіх бацькоў. Напярэдадні Дня сям'і малыя па традыцыі падрыхтавалі для бацькоў прыемныя сюрпрызы. Калі ж з вуснаў дзетак гучаць цёплыя і шчырыя пажаданні, сэрцы таты і мамы напаўняюцца прыемным хваляваннем. Вось яно, светлае і чыстае бацькоўскае шчасце! Менавіта яно ўпрыгожвае, працягвае жыццё і робіць нашы будні яркімі і непаўторнымі...

**Святлана ВАЗНЯК.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **КХ «СПАРТАН-АГРО»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 16.06.2025 в 11.00.**

**Лот № 1:** Экспериментально-производственный корпус № 14 с инв. № 710/U-5536, 3775,0 кв. м.

Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 13Б.
Начальная цена без НДС – 42,00 руб.
Задаток – 42,00 руб.

Незавершённое законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 710/U-5536 расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000007001139 (площадь 0,7153 га). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **12.06.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**информирует о проведении 10 июня 2025 г. в 10.00 открытых электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего РУП «Производственное объединение «Белоруснефть» на праве хозяйственного ведения**

| Предметы электронных торгов: |
|---|
| **Лот № 1: автомобиль ГАЗ 2752,** рег. знак ЕС 9744, 2005 года выпуска. Тип: грузопассажирский фургон. Цвет: сине-зеленый. Номер кузова (рамы) 27520050168365 X9627520050404889. Объем двигателя: 2,4 л. Вид топл.: бензин. Не на ходу, самовывоз со стоянки продавца. Местонахождение: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Энергетиков, 4. **Начальная цена лота № 1: 3 816,56 рубля** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 381,66 рубля** (в т. ч. НДС 20 %) |
| **Лот № 2: автомобиль ГАЗ 2752, рег.знак АА 8385-3, 2006 года выпуска.** Тип: грузопассажирский фургон. Цвет: красный. Номер кузова (рамы) X9627520070515830. Объем двигателя: 2,4 л. Вид топлива: бензин. Не на ходу, самовывоз со стоянки продавца. Местонахождение: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Энергетиков, 4. **Начальная цена лота № 2: 4 071,25 рубля** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 407,13 рубля** (в т. ч. НДС 20 %) |
| **Лот № 3: автомобиль VAZ-21310 141-41,** рег. знак 2156 ЕЕ-3, 2011 года выпуска. Тип: легковой специальный внедорожник универсал. Цвет: серебристый металлик. Номер кузова (рамы) XTA213100B0116684. Объем двигателя: 1,7 л. Вид топлива: бензин. Не на ходу, самовывоз со стоянки продавца. Местонахождение: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Заводская, 10. **Начальная цена лота № 3: 3 353,53 рубля** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 335,35 рубля** (в т. ч. НДС 20 %) |
| **Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки:** Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47, 32-18-95; +375 29 170-46-47; **электронный адрес ЭТП: www.gostorg.by;** сайт: ino.by; e-mail: auction-gino@gino.by |
| **Извещение о проведении аукциона опубликовано 08.05.2025 г. на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by по ссылке на ЭТП «GOSTORG» и Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.gov.by** |

УНП 401166490



ИНФОРМАЦИЯ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64) по поручению **Государственного учреждения «Молодечненский межотраслевой центр обеспечения деятельности бюджетных организаций»** (222310, г. Молодечно, ул. Я. Ясинского, 21), в интересах **«Марковского сельского исполнительного комитета»** проводит повторный открытый аукцион

**по продаже автомобиля легкового (седан) VOLKSWAGEN PASSAT,**
**2006 г. в., кузов (VIN) WVWZZZ3CZ6P193994, цвет серебристый, инвентарный номер 01510002, находящегося по адресу: Минская область, Молодечненский район, д. Марково, ул. 17 Сентября.**

**Начальная цена** (без НДС) – **7 980,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **798,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 30 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by. Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.
***Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 28.02.2025.***
Электронные торги состоятся **29.05.2025** в **10.00.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.05.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел для осмотра транспорта (8033) 634 32 90, время осмотра с 9.00 до 16.00 понедельник – пятница.**

УНП 692245892

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Могилевский лесхоз, г. Могилев, ул. Крупской, 140. УНП 700336549 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машина погрузочно-транспортная МПТ-461.1 (в составе с **трактором «Беларус-82.2»,** рег. № ТВ-6 1648, зав. № 172001952, 2012 г. в. и **полуприцепом ПЛ-9**, рег. № БЮ 3372, зав. № 1002 (0450), 2013 г. в.) | **60 600,00** |
| 2 | **Прицеп специальный ПС-30,** рег. № ТВ-6 8135, зав. № 053, 2012 г. в. | **24 000,00** |
| 3 | **Грузовой лесовоз УРАЛ 4320**, рег. № ТВ 1654, кузов № 012183, 1982 г. в. | **10 920,00** |
| 4 | **Трактор «Беларус 892.2»**, рег. № IB-6 3376, зав. № 90827961, 2014 г. в. | **19 560,00** |
| 5 | Грузовой специальный сортиментовоз **MAZ 6317 X9-(1444)**, рег. № AI 0103-6, кузов № Y3M6317X9E0M00232 Y3M6317X9E0000232, 2014 г. в. | **36 927,60** |

**Местонахождение – г. Могилев, ул. Крупской, 140**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 09.06.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **06.06.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу **(http://gki.gov.by)**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **филиала «Минский» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества в составе:**

- **капитальное строение с инв. № 600/С-176490 (сторожка с элементами благоустройства (забор железобетонный), общая площадь – 6,4 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62/6, район д. Звенячи;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175581 (здание телятника, общая площадь – 889 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/4, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175568 (птичник № 1, общая площадь – 1549,2 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62, район д. Звенячи;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175569 (птичник № 2, общая площадь – 1049,8 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/1, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175572 (птичник № 3, общая площадь – 1484,1 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/2, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175574 (сарай для сена, общая площадь – 611,6 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/3, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175587 (пометохранилище (инвентарный номер 7194-20, площадь – 3349 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А, район д. Аксаковщина;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175583 (площадка для компостирования помета (инв. № 7194-1), площадь – 3068 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 32,42 м. севернее д. Звенячи;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175584 (скважина водоснабжения), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 32,42 м. севернее д. Звенячи;**
- **капитальное строение с инв. № 600/С-175582 (башня водонапорная, общая площадь – 1,5 кв. м), адрес: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А/5, район д. Аксаковщина *(далее – Объекты).***

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623681300001000829 площадью 4,0516 га, адрес земельного участка: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, 62А, район д. Аксаковщина.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 1 488 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 148 800,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901,** код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов, а также оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2025.

Аукцион состоится **26.05.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.05.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра 8 (029) 116 45 00.**

УНП 601088545

# У ДОБРЫ ШЛЯХ!

## Беларусь і Кітай маюць намер умацоўваць транспартна-лагістычныя сувязі

Дэлегацыя Мінтранса Беларусі днямі прыняла ўдзел у пасяджэнні Камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве, якое адбылося ў Пекіне.

Як растлумачылі ў прэс-службе ведамства, бакі абмеркавалі планы сумеснай работы на найбліжэйшую перспектыву. Парадак дня ўключаў пытанні нарошчвання гандлёвага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, развіцця транспартна-лагістычнага ўзаемадзеяння, прасоўвання праектаў Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

На сустрэчы было агучана, што за 2024 год аб'ём перавозак чыгуначным транспартам у зносінах Кітай — Беларусь — Кітай склаў больш за 500 тысяч кантэйнераў (або 144 % да ўзроўню 2003 года).

Акрамя таго, падчас візіту дэлегацыі Мінтранса ў Пекін адбылася сустрэча кіраўнікоў транспартных ведамстваў Беларусі і КНР, на якой абмяркоўваліся асноўныя напрамкі развіцця супрацоўніцтва ў галіне транспарту. Беларускі бок узначаліў міністр транспарту і камунікацый Аляксей Ляхновіч, кітайскі — міністр транспарту КНР Лю Вэй.



У цяперашні час Беларусь і КНР актыўна супрацоўнічаюць у сферы аўтамабільнага, чыгуначнага і паветранага транспарту. Як адзначыў Аляксей Ляхновіч, развіццё ўзаемадзеяння ў галіне транспарту служыць надзейнай асновай далейшага павелічэння аб'ёмаў гандлю паміж дзяржавамі. У прыватнасці, рэалізацыя стратэгіі партнёрства на найбліжэйшую перспектыву прадугледжвае крокі па ўмацаванні транспартна-лагістычных сувязяў, паскарэнні апрацоўкі грузаў, развіцці патэнцыялу транзітных перавозак праз тэрыторыю Беларусі.

Кіраўнік Мінтранса Беларусі акцэнтаваў увагу на неабходнасці ўмацавання супрацоўніцтва ў сферы аўтамабільнага транспарту, які адыгрывае значную ролю ў транспарціроўцы знешнегандлёвых грузаў.

У сваю чаргу міністр транспарту КНР Лю Вэй запэўніў, што кітайскі бок цалкам падтрымлівае імкненне да дынамічнага развіцця двухбаковых адносін і гатовы ўмацоўваць кантакты для далейшага развіцця аўтаперавозак паміж КНР і нашай краінай.

# РАЗУМНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

## Новы рэзідэнт парка «Вялікі камень» распрацуе праграмную платформу для аўтамабіляў




Днямі ў Беларуска-Кітайскім індустрыяльным парку «Вялікі камень» зарэгістраваны новы рэзідэнт — ТАА «ОПЕНИ» (Беларусь).

Як паведамілі ў адміністрацыі парка, праект кампаніі звязаны з распрацоўкай інавацыйнай праграмна-апаратнай платформы для галаўнога ўстройства аўтамабіляў. Яна дазволіць забяспечыць пашыраныя магчымасці па яго кіраванні, маніторынгу тэхнічнага стану, мультымедыйным узаемадзеянні. Адным з ключавых складнікаў стане стварэнне ўніверсальнага тэлематычнага модуля T-BOX, які забяспечвае двухбаковую сувязь аўтамабіля з адпаведнымі сэрвісамі і мабільным дадаткам.

# НА ДАЛЁКАЙ ДУЗЕ

## БУТБ пашырае супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі

Гэта адзін з самых перспектыўных напрамкаў развіцця трансгранічнага біржавога гандлю для Беларусі, таму (з улікам ёмістасці рынку і попыту на беларускую прадукцыю) гэтаму рэгіёну будзе аддавацца асаблівая ўвага.

Такую заяву зрабіў начальнік упраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці БУТБ Аляксандр Башлій на сустрэчы з дэлегацыяй дзелавых колаў Тагалезскай Рэспублікі і Рэспублікі Малі, паведамілі ў прэс-службе біржы.

Тут дадалі, што афрыканскія краіны цікавыя як спажыўцы тавараў, якія рэалізоўваюцца на біржы (піламатэрыялы, сухое малако, цукар), і як пастаўшчыкі неабходнай беларускім прадпрыемствам сыравіны (соевыя і какава-бабы, тэкстыль, экзатычная садавіна).

— Біржа гатова прапрацаваць усе пазіцыі і сабраць пул беларускіх пакупнікоў з рэальнымі афертамі для кампаній з Тога і Малі, — запэўнілі ў БУТБ.

Дарэчы, па стане на ўчарашні дзень на БУТБ было акрэдытавана 8350 замежных кампаній, у тым ліку 15 з краін Афрыкі, сярод якіх Егіпет, Кенія, Кот-д'Івуар, Сейшэльскія Астравы, Сенегал і ПАР.



# ЗАПАСЫ РАСТУЦЬ

## Золатавалютныя рэзервы Беларусі выраслі амаль на 900 мільёнаў долараў



А калі больш дакладна, то на 872,7 мільёна долараў за красавік 2025 года і склалі 10 мільярдаў 942,3 мільёна долараў па стане на 1 мая, абнавіўшы гістарычны максімум.

— Дасягненне рэкорднага ўзроўню забяспечана ў першую чаргу павелічэннем рэзерваў у замежнай валюце на 513,2 мільёна долараў на фоне росту прапановы валюты на ўнутраным рынку, — пракаментавалі аналітыкі Еўразійскага банка развіцця ў сваім штотыднёвым макраагля дзе.

Яны таксама адзначылі, што рост кошту золата на 326,3 мільёна долараў у складзе рэзерваў з-за росту коштаў на яго на 6 % за месяц таксама стаў значным фактарам росту рэзерваў.

Дарэчы, з пачатку года золатавалютныя рэзервы Беларусі выраслі на 2 мільярды 19,7 мільёна долараў, або больш чым на 22 %.

# АД ХОЛМСКІХ ВАРОТ ДА РЭЙХСТАГА




## Пройдземся па выстаўцы «Дарога да Перамогі» ў Міжнародным выставачным цэнтры

Адкрыццё Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра стала выдатным падарункам да юбілею Вялікай Перамогі. А для таго, каб беларусы не забываліся, дзякуючы каму сёння ў нас ёсць магчымасць ствараць падобныя аб'екты і ўпрыгожваць імі краіну, разгорнута адпаведная выстаўка «Дарога да Перамогі». Экспазіцыі падрыхтаваны намаганнямі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, рэгіянальнымі музеямі, Нацыянальным архівам Беларусі, Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў, Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм».

Кампазіцыйны цэнтр выстаўкі — плошча Перамогі ў тым выглядзе, у якім яе ведае кожны беларус. Вакол яе — тэматычныя раздзелы, прысвечаныя асноўным вехам ваеннай гісторыі. Пачынаецца ўсё з гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці, менавіта праз Холмскія вароты наведвальнікі трапляюць на выстаўку. Стэнды расказваюць пра абарончыя баі на беларускай тэрыторыі. У раздзеле, прысвечаным генацыду беларускага народа, прадстаўлены жудасныя факты расправы над мірным насельніцтвам. Інтэрактыўная карта расказвае цікавыя факты пра партызанскі і падпольны рух — народный барацьбе з ворагам прысвечана нямала ўвагі.

Тут можна атрымаць інфармацыю аб сваіх продках, якія здабывалі перамогу. Выстаўка дазваляе пачуць запісы ўспамінаў удзельнікаў вайны. А на друкарскай машынцы, зробленай па прыкладзе таго часу, можна надрукаваць ваенную лістоўку і захаваць на памяць. Кульмінацыя выстаўкі — узняцце сцяга Перамогі над Рэйхстагам. У акулярах дапоўненай рэальнасці можна нават паўтарыць шлях Ягорава і Кантарыі і падняцца на дах Рэйхстага. Менавіта ў сучасных мультымедыйных і інтэрактыўных сродках — разынка гэтай выстаўкі. Відэафільмы з ужываннем 3D-графікі, галаграм, акуляры віртуальнай рэальнасці і святлодыёдныя экраны дапамагаюць хоць часткова, але паглыбіцца ў тую атмасферу. І няхай у поўнай меры яны не перададуць жах і страх вайны, але здольныя паказаць, што гэта невыносна цяжка і не дай бог, каб гэта здарылася зноў.

Наведаць выстаўку «Дарога да Перамогі» ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры не проста патрэбна — неабходна. Яна працуе з 12 да 20 гадзін і будзе дзейнічаць да 5 ліпеня. Уваход вольны.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**






СУПРАЦОЎНІЦТВА

# МАРШРУТАМ ПАМЯЦІ

## Удзельнікі патрыятычнай акцыі «Непакораныя» разгарнулі Сцяг Перамогі ў Брэсцкай крэпасці

Маладзёжная патрыятычная акцыя «Непакораныя», прысвечаная 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, праходзіць з 9 да 26 мая. Яна аб'ядноўвае 15 гарадоў Расіі і Беларусі. Гэты маршрут памяці, пачынаючы ад Брэста і заканчваючы Севастопалем, складзе пяць тысяч кіламетраў. Праект, накіраваны на захаванне гістарычнай памяці і патрыятычнае выхаванне моладзі, падтрымалі Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі.



Фота БелТА.

Стартавала акцыя ў Маскве. Яе ўдзельнікі — 100 чалавек — учора прыбылі ў Брэст. Гэта актывісты маладзёжных, грамадскіх, патрыятычных арганізацый, студэнты універсітэтаў дзвюх краін. Далучылася і брэсцкая моладзь. У першай палове дня юнакі і дзяўчаты пабывалі на экскурсіі ў Брэсцкай крэпасці, усклалі кветкі, ушанавалі памяць абаронцаў хвілінай маўчання. Адной з сімвалічных дзеяў акцыі стала разгортванне самага вялікага ў свеце Сцяга Перамогі. Яго шырыня — 35 метраў, а даўжыня — 65. Палотнішча разгарнулі побач з манументам «Мужнасць».

Маладых людзей прывіталі **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей ХАМЕНКА і намеснік Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Юрый ВАРАБ'ЁЎ.**

Сяргей Хаменка назваў мэтай рэалізацыі падобных ініцыятыў імкненне старэйшых данесці да маладога пакалення разуменне таго, што падзеі 1941—1945 гадоў не павінны паўтарыцца: «Трэба, каб і праз 25, і праз 50, і праз 100 гадоў усе памяталі аб трагедыі нашай зямлі і гераізме, які праявіў савецкі салдат, каб вызваліць родную зямлю ад навалы. Гістарычная памяць — падмурак будучыні».

Маршрут экспедыцыі працягнецца ў іншых гарадах Беларусі, затым удзельнікі накіруюцца ў Расію.

**Организатор торгов (ликвидатор Совместного общества с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс») объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества в форме аукциона**

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс» |
| **Место проведения торгов** | г. Минск, ул. Лещинского, дом 12, комн. 9 |
| **Дата и время проведения торгов** | 04.06.2025 г. в 12.00 |
| **Срок подачи заявок** | Не позднее 30.05.2025 г. до 17.00 |
| **Ранее опубликованные извещения о проведении торгов** | газета «Звязда» от 02.12.2023 № 234 (300964), от 14.02.2024 № 31 (30165), от 13.04.2024 № 74 (30208), от 18.09.2024 № 182 (30316), от 29.11.2024 № 233 (30367), от 04.02.2025 № 23 (30411), от 25.03.2025 № 58 (30446) |

**Предмет торгов и начальная цена**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43932, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12, общей площадью 1204,5 кв. м, наименование: главный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 2 810 000 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43933, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/1, общей площадью 721,9 кв. м, наименование: помещение мойки, кафе, административные помещения, назначение: здание многофункциональное, расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 525 000 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43836, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/2, общей площадью 538,4 кв. м, наименование: вспомогательный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 045 000 |

| | |
|---|---|
| **Обременения** | В отношении всех лотов – ипотека, аренда |
| **Порядок подачи заявок** | Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются по месту проведения торгов либо направляются по адресу: 220052, г. Минск, а\я 17 (получатель – ликвидатор СООО «Петрофф Плюс» ИП Ржеутский А.В.), со дня выхода настоящего извещения |
| **Задаток** | Задаток в размере десяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY90 PJCB 3012 0763 3310 0000 0933 в «Приорбанк» ОАО, г. Минск, БИК PJCBBY2X, получатель – СООО «Петрофф Плюс», УНП 190861019 |
| **Условия аукциона** | Шаг аукциона: пять процентов. При признании торгов несостоявшимися, в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, а также победитель аукциона – претендент на покупку должен заключить с продавцом договор купли-продажи в течение двух рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.<br>Оплата стоимости предмета торгов осуществляется в течение пяти банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не определено договором купли-продажи. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов, осуществляется участником, выигравшим торги, в течение пяти банковских дней со дня проведения торгов.<br>Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения.<br>Порядок проведения аукциона установлен Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 |

**С дополнительной информацией можно ознакомиться по тел. +375 29 667 16 72.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Заславльбурвод»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 26.05.2025.**

**Лот № 1 в составе:**

1. Административно-производственный корпус, инв. № 630/С-46558, 700 кв. м;
2. Склад, инв. № 630/С-46559, 269 кв. м;
3. Проходная, инв. № 630/С-46560, 54,9 кв. м;
4. Здание мастерской, инв. № 630/С-81238, 106,9 кв. м.

Адрес лота: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Змитрока Бядули, 15/1; 15/2; 15; 15/3.

Обременение: аренда.

Начальная цена без учета НДС – 168,00 руб. (цена каждого объекта лота равна базовой величине). Задаток – 16,80 руб.

Земельный участок 642000000001001543, 1,0031 га.

Право постоянного пользования.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **22.05.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

МЕРКАВАННЕ

# МІКС З АГАРОДНІНЫ

## Можа здарыцца так, што ўвосень бульба, морква і цыбуля не будуць папулярным таварам



**Вядома, агародніна — тавар абсалютна сезонны. Натуральна, што да вясны яна даражэе. Запасы старога ўраджаю заканчваюцца, новы яшчэ толькі ў планах. Маладая агародніна ў большасці імпартная, у маі яна паспявае хіба што ў далёкіх краях, а таму заўсёды дарагая. Але сёлета цэннікі на тую самую бульбу і капусту вырваліся за межы разумнага. Мытыя айчынныя леташнія клубні не самага элітнага памеру і выгляду без сораму прадаюць па 3-4 рублі. Гэта ў магазінах, якія перыядычна падвяргаюцца крытыцы дзяржорганаў і стараюцца не даводзіць да граху і ўвядзення адміністрацыйных мер рэгулявання. На рынках могуць і 4-5 рублёў за кілаграм папрасіць. Іншы раз гандляры нават усміхаюцца: маўляў, гэта яшчэ не апошняя цана. Можа быць і даражэй. Добра, што ўжо з'явіліся маладыя карняплоды імпартнага вырошчвання. Напрыклад, егіпецкія па 8-10 рублёў за кіло. На іх фоне родная агародніна здаецца не такой ужо і дарагой. Вельмі цікава было б даведацца: такія кацiроўкі на празаічную прадукцыю — вынік неўраджаю ў мінулым годзе, кан'юнктуры ў суседняй Расіі, прагнасць вытворцаў, захавальнікаў і прадаўцоў з імпарцёрамі ці ўсе фактары сышліся разам і гуляюць супраць спажыўцоў? А яны злапамятныя і помслівыя. І яшчэ дадуць свой адказ, скажуць важкае слова і да восені могуць прынцыпова байкатаваць прадаўцоў агародніны. Агароды і прысядзібныя ўчасткі яшчэ ніхто не адмяняў.**

Да бясконцасці цэнамі з пакупніка здзекавацца нельга. Асабліва калі гаворка ідзе пра тыя тавары і паслугі, якія, уласна кажучы, кожны можа атрымаць сваімі сіламі. А гародніна да такой катэгорыі прадукцыі і адносіцца. Урбанізацыя ў Беларусі дасягнула апагею, але канчаткова сувязь з зямлёй беларусы не разарвалі. Нядаўна міністр эканомікі Юрый Чабатар прывёў лічбы: у краіне толькі садовых таварыстваў 4,7 тысячы. Іх плошча — каля 60 тысяч гектараў. А яшчэ ёсць хаткі, якія фармальна лічацца вясковымі, але выкарыстоўваюцца гараджанамі для загараднага адпачынку. Калі не ва ўсіх, то шмат у каго яшчэ засталіся сваякі ў вёсцы. Вядома, у бабуль і дзядуляў не заўсёды ёсць ужо сілы, каб у поўнай меры апрацоўваць прысядзібныя надзелы, якія нярэдка могуць вымярацца дзясяткамі сотак. Гарадская моладзь да «паншчыны» ў пажылых сваякоў таксама ставіцца скептычна. З'яўляецца на градках у лепшым выпадку з-за павагі да старых, каб ім дапамагчы. Рацыянальнасць аграрных работ выхаднога дня і ў водпуску выклікае сумненні: навошта ўкалваць у дні законнага адпачынку, калі ўсё можна купіць у магазіне. І па нармальнай цане. Ці не лепш аддаць агародніцтва прафесіяналам — фермерам?!

Так, прынамсі, было раней. Аднак калі тая ж бульбачка вырасла ў цане фенаменальна, то, мабыць, нават самы лянівы гараджанін сёлета хаця б некалькі дзясяткаў бульбін кіне ў зямлю. Калі не з любові да сельскай дзейнасці, то лагічна страхуючы асабістую харчовую бяспеку. І працэс, мяркуючы па ўсім, пайшоў і вельмі актыўна. Прынамсі, насенны матэрыял разыходзіцца надзвычай добра. Прагматычныя беларусы вырашылі падзарабіць на сваіх сотках, плануючы скарацiць выдаткі на гародніну за кошт уласнай вытворчасці.

А вырасцім жа бульбу, з якой узніклі раптам праблемы ў гэты зімовы сезон. Многа ці мала — надвор'е пакажа. Але вытворчасць для асабістага карыстання адназначна павялічыцца. І знойдзецца месца ў дачным склепе, гаражы, на лоджыі, каб захаваць ураджай да вясны. Добра, што ў паловы беларусаў у той ці іншай ступені вопыт гаспадарання з элементамі натуральнага прысутнічае. Як і традыцыя хаця б часковага самазабеспячэння прадуктамі харчавання. Савецкая сельская гаспадарка, прынамсі, у Беларусі была даволі магутнай галіной. І аб'ёмы вытворчасці былі даволі вялікімі. Іншае пытанне, што Беларусь з'яўлялася магутнай сыравіннай базай для забеспячэння буйных гарадоў. Перш за ўсё — саюзных сталіц Масквы і Ленінграда, цяперашняга Санкт-Пецярбурга. Таму ўсе нашы буйныя мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы гістарычна знаходзяцца на чыгуначных вузлах, якія прамымі маршрутамі звязваюць з гэтымі мегаполісамі. Зрэшты, выраблялі ў БССР прадуктаў харчавання даволі шмат. І прадуктовае забеспячэнне ў параўнанні са многімі рэгіёнамі ў рэспубліцы было нават вельмі прыстойным. Прынамсі, у даперабудовачныя часы.

Іншае пытанне, што савецкая сістэма мела на ўвазе пэўны аскетызм. Таму разнастайнасцю спажыўцоў, прама скажам, не песцілі. Тая ж агародніна была таннай, але тэхналогія захоўвання не была самай перадавой. Таму і бульба не вызначалася ідэальнай каліброўкай і эстэтыкай вонкавага выгляду. Агуркі, памідоры, яблыкі і іншая садавіна-агародніна фактычна былі сезонным таварам: у магазінах прысутнічалі толькі ў перыяд іх паспявання. Аб круглагадовым забеспячэнні свежай зелянінай калі і задумваліся, то на практыцы гэтыя праекты нават блізка рэалізаваны не былі. Таму некалькі дачных сотак з'яўляліся для савецкага чалавека маннай нябеснай. Не толькі з пункту гледжання магчымасці яднання з прыродай, але і магчымасці разнастаіць свой рацыён, бо рабіліся багатыя запасы на зіму: узвары, варэнне, разнастайныя саленні... Народная фантазія — невычарпальная на генерыраванне розных тэхналогій і рэцэптур. Вядома, не ўсе займаліся хатнімі нарыхтоўкамі: у меру магчымасцяў (дача была калі не раскошай, то не паўсюдным з'явай), сіл і працавітасці. Але многія запаўнялі восенню кладоўкі і шафы дарамі прыроды ў розных відах. Са з'яўленнем супермаркетаў з вельмі шырокай разнастайнасцю прадукцыі — і свежай, і перапрацаванай — цяга да хатняй творчасці паменшылася. Ды і эканамічная мэтазгоднасць выклікала пэўныя сумненні.

Але бульбяная інфляцыя адназначна прымусіць беларусаў згадаць, што раней было, і аднавіць былыя традыцыі. І не здзіўлюся, калі гэтай восенню бульба, морква, капуста не тое каб зусім будуць нікому не патрэбныя, але попыт на іх значна знізіцца. Многія забяспечаць сябе самі. Або ў кааперацыі са сваякамі ці знаёмымі з сельскай мясцовасці. Таму на месцы вытворцаў і рытэйлу я не вельмі радаваўся б удалай кан'юнктуры. Спажывец у сілах яе вельмі хутка змяніць. І тады ўзнікне іншая праблема: а як рэалізаваць ураджай?! Адназначна, развіццё падзей мяркуецца нават вельмі цікавае. Будзем вывучаць тэндэнцыі новай хвалі.

**Інтэлект Штучны.**


УНП 291313486

Отчет за 1 квартал 2025 год

ООО «Санта Ритейл»

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 31 марта 2025 года**

тыс. руб.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31.03.2025 | На 31.12.2024 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 467 613 | 481 443 |
| Нематериальные активы | 120 | 3 199 | 3 371 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 14 346 | 11 511 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 155 | 155 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 0 | 0 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 0 | 0 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **485 313** | **496 480** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 152 496 | 171 701 |
| в том числе: материалы | 211 | 10 163 | 9 947 |
| готовая продукция и товары | 214 | 142 333 | 161 754 |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 0 | 0 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 522 | 171 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 183 | 378 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 53 679 | 55 008 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 0 | 0 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 72 810 | 52 035 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 94 | 94 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **279 784** | **279 387** |
| **БАЛАНС** | **300** | **765 097** | **775 867** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31.03.2025 | На 31.12.2024 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 164 655 | 164 655 |
| Резервный капитал | 440 | 15 | 15 |
| Добавочный капитал | 450 | 237 476 | 237 621 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 619 | 483 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 15 207 | 0 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **417 972** | **402 774** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 0 | 0 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 749 | 732 |
| Доходы будущих периодов | 540 | 0 | 0 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 0 | 0 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **749** | **732** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 0 | 0 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 75 058 | 75 078 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 271 318 | 297 277 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 223 540 | 253 094 |
| по авансам полученным | 632 | 956 | 2 059 |
| по налогам и сборам | 633 | 30 238 | 23 363 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 3 882 | 4 200 |
| по оплате труда | 635 | 12 230 | 12 587 |
| по лизинговым платежам | 636 | 0 | 0 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 0 | 0 |
| прочим кредиторам | 638 | 472 | 1 974 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 0 | 6 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **346 376** | **372 361** |
| **БАЛАНС** | **700** | **765 097** | **775 867** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**за январь–март 2025 года**

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–март 2025 | За январь–март 2024 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 620 710 | 565 431 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (461 636) | (427 430) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 159 074 | 138 001 |
| Управленческие расходы | 040 | (11 990) | (12 534) |
| Расходы на реализацию | 050 | (132 120) | (120 174) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 14 964 | 5 293 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 14 838 | 12 260 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (8 243) | (8 326) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 21 559 | 9 227 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1 906 | 5 884 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 426 | 5 764 |
| проценты к получению | 103 | 1 470 | 89 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 10 | 31 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (291) | (4 428) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (290) | (4 412) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (1) | (16) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 1 079 | 993 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 1 079 | 993 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (2 514) | (4 929) |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | (1 757) | (4 001) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (756) | (926) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (1) | (2) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | 180 | (2 480) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 21 739 | 6 747 |
| Налог на прибыль | 160 | (6 516) | 0 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 0 | 0 |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (16) | 52 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | 0 | 0 |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | 0 | 0 |
| Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200) | 210 | 15 207 | 6 799 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 0 | 0 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | 0 | 0 |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 15 207 | 6 799 |



Суботнім ранкам Камароўскі рынак прачынаецца разам з горадам. Пакуль сонца толькі пачынае ззяць на дахах дамоў, першыя пакупнікі ўжо асцярожна крочаць па радах з насеннай бульбай, аглядаюць клубні, задаюць пытанні, таргуюцца...

НА СВАЕ ВОЧЫ

# ПА «СЯМЯНКУ»

## Бульба як мастацтва

Камароўка — нібы люстэрка прыярытэтаў. Менавіта тут выразна відаць, што людзі садзяць, якая бульба сёння ў пашане, якая адыходзіць у мінулае. Мы прайшлі некалькі прылаўкаў, параўналі цэны, прапановы і, самае галоўнае, пачулі меркаванні людзей, для якіх бульба — не проста гародніна, а частка жыцця.

### АД «КАРАЛЕВЫ ГАННЫ» ДА «СКАРБУ»

На першым прылаўку, да якога падыходзім, — «Каралева Ганна» і «Скарб», па 5 рублёў за кіло. Прадавец упэўнена кажа: «Каралеву Ганну» выбіраюць «і на варку, і на жарку». Яна ўніверсальная». Гэтыя словы часта гучаць на рынку. Каштоўна, калі бульба без капрызаў: што ні зрабі — смачна. А «Скарб» — для тых, хто любіць пюрэ. Рассыпістая, смачная, праверaная.

На суседнім прылаўку выбар шырэйшы: «Ласунак», «Маніфест», «Каралева Ганна» — усе па тыя ж 5 рублёў. Але найбольшай увагі заслугоўваюць не назвы, а словы прадаўца: «Гэта першая рэпрадукцыя. Бульба элітная, з-пад Смалявічаў. Натуральная...». З аднаго боку, ён гаворыць гэта з упэўненасцю, як чалавек, які часта мае справу з пакупнікамі, што прыходзяць па нешта «сапраўднае». З іншага боку, бульбу яму прывозяць оптам — значыць, бачыць, як яна расце, ён сам не можа. Усё трымаецца на даверы да пастаўшчыка і, магчыма, на асабістым досведзе: ужо не першы сезон працуе з гэтым таварам, ведае, што людзі вяртаюцца і просяць зноў.

Таму такі каментарый — гэта не рэклама, а спроба арыентаваць пакупніка на тое, што працуе. Не ўсе гатовы купляць у краме — там, маўляў, усё «пластыкавае», і нават калі напісана «насенная», вынік часта падманвае. Тут жа вядомая мясцовасць, больш-менш стабільная якасць і адсутнасць тых рызык, што бываюць з незразумелым паходжаннем. Можна сказаць, што гэта тыповая логіка пакупніка: купляць не лепшае, а знаёмае. І такі падыход зусім зразумелы.

На трэцім прылаўку «Каралева Ганна» па 4—5 рублёў. Без дадатковай інфармацыі, але і без сумневаў: калі столькі прылаўкаў прадаюць адзін і той жа сорт, значыць, ён сапраўды варты даверу.

Ідзём далей — і зноў «Каралева Ганна» (5 рублёў) і «Ласунак» (3,30 рубля за кілаграм). Прадавец па-філасофску заўважае: «Адзін і той жа сорт можна садзіць хоць 10 гадоў, галоўнае — каб падабаўся». Гэта праўда. У агародзе галоўнае — любоў да таго, што саджаеш. Бо ў кожнай бульбіне — твая праца, твае чаканне ўраджаю, твае надзеі на восеньскую скрыню з запасамі.

### НЕ ПРОСТА КЛУБЕНЬ

А каля аднаго прылаўка прадаўшчыца, відаць, ужо прызвычаіўшыся да пытанняў пакупнікоў пра тое, як садзіць, ахвотна дзеліцца сваімі ведамі:

— Садзіць трэба ў разорку на глыбіню 25—30 см, каб карані добра прыжыліся і каб бульба атрымала максімум пажыўных рэчываў. Туды абавязкова кладзём гной. Яго трэба дадаваць добрую колькасць, бо гэта тыя самыя рэчывы, што патрэбныя бульбе для росту. Можна замест гною дадаць сумесь азоту, калію і фосфару...

Слухаючы гэту сімпатычную жанчыну, я пачаў разумець, што яе веды пра пасадку бульбы — не толькі тэхнічныя парады. Гэта асаблівы падыход да працы з зямлёй, гэта разуменне прыроды, яе рытмаў і законаў. Бо жыць з зямлёй — значыць умець разумець яе.

У гэтых словах — цэлая культура. Толькі падумаць: адна бульбінка — і колькі працы, ведаў, умення, любові. Гэта не пра «пасадзіў — вырасла». Гэта пра ўменне назіраць, разумець зямлю, адчуваць рытмы прыроды. І таму нельга сказаць, што бульба — проста ежа. Гэта частка нацыянальнага кода. Гэта сувязь з продкамі, якія рабілі тое самае: ускопвалі, садзілі, акучвалі. І ўсё — каб увосень было што есці, чым падзяліцца, чым ганарыцца.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Санбридж», УНП 193082719, 220030, г. Минск, ул. Мясникова, д. 32, пом. 2 (каб. 30, этаж 7) |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Вторые повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 18.03.2025 в газете «Звязда»** | |

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2100/1000/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 739,20 |
| 2 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2200/1000/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 739,20 |
| 3 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 1650/1100/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1310,40 |
| 4 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2600/1000/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 2419,20 |
| 5 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали, Г – образная форма. Размер 2600/2400/1200/1000/600 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 2956,80 |
| 6 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 2600/1400/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-UV | 18412,80 |
| 7 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 6300/2600/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream D-90-UV | 27552,00 |
| 8 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 6300/2600/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream D-90-UV | 27552,00 |
| 9 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 1300/1500/600 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90-UV | 11424,00 |
| 10 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 1300/1300/600 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90-UV | 10046,40 |
| 11 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 2450/1400/650 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90-WW Mistry | 17337,60 |
| 12 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 2400/1300/650 mm, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream E-90-UV | 19824,00 |
| 13 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2000/1400/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90 | 10785,60 |
| 14 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 4000/1900/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90 | 12096,00 |
| 15 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 3700/1400/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1243,20 |
| 16 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 990/990/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1041,60 |
| 17 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2350/1100/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1411,20 |
| 18 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 3400/2400/600 mm, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream E-90-UV | 43344,00 |
| 19 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 990/990/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 940,80 |
| 20 | Отопительное оборудование, состоящее из 6 позиций (котел паровой, экономайзер, шкаф управления и т. д.) | 96969,6 |
| 21–58 | Ковровое покрытие тканое, тип Wilton для апартаментов тип King (дизайн ME-227-C, состав 80 % шерсть, 20 % нейлон), торговая марка – Alarwool, мод. дизайн ME-227-C (рулон 77,8 кв. м, размер 19.45*4) | 1436,81 |
| 59 | Приточная установка Hidria, тип П-29, В-29, заводской номер 55685 2000, 2014 г. в. | 48720,00 |
| 60 | Приточная установка Hidria, тип П-30, В-30, заводской номер 55686 2000, 2014 г. в. | 28644,00 |
| 61 | Приточная установка Hidria, тип П-21, В-21, заводской номер 55687 2000, 2014 г. в. | 25284,00 |
| 62 | Приточная установка Hidria, тип П-23, В-23, заводской номер 55688 2000, 2014 г. в. | 19656,00 |
| 63 | Приточная установка Hidria, тип П-24, В-24, заводской номер 55689 2000, 2014 г. в. | 16632,00 |
| 64 | Приточная установка Hidria, тип П-18, В-18, заводской номер 55690 2000, 2014 г. в. | 27888,00 |
| 65 | Приточная установка Hidria, тип П-28, В-28, заводской номер 55691 2000, 2014 г. в. | 71316,00 |
| 66 | Приточная установка Hidria, тип П-1, В-1, заводской номер 55692 2000, 2014 г.в. | 37632,00 |
| 67 | Приточная установка Hidria, тип П-16, В-16, заводской номер 55693 2000, 2014 г. в. | 20832,00 |
| 68 | Приточная установка Hidria, тип П-19, В-19, заводской номер 55694 2000, 2014 г. в. | 44184,00 |
| 69 | Приточная установка Hidria, тип П-34, заводской номер 55695 2000, 2014 г. в. | 21336,00 |
| 70 | Приточная установка Hidria, тип П-20, заводской номер 55696 2000, 2014 г. в. | 7896,00 |
| 71 | Приточная установка Hidria, тип П-33, заводской номер 55697 2000, 2014 г. в. | 12852,00 |
| **Первые публичные торги (аукцион в очной форме)** | | |
| 72–333 | Имущество ООО «Санбридж», состоящее из 262 лотов (воздуховоды, клапаны противопожарные, краны, конвекторы и т. д. Полный перечень лотов с начальными ценами размещен в открытом доступе на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» **www.iin.by** | |
| **Первые публичные торги в форме электронного аукциона** | | |
| 334 | Воздуховод из листовой стали толщиной до 0,9 мм, периметр до 320/1000мм (С-14), 567,78 м² | 10424,44 |
| 335 | Инсталяция для подвесного унитаза, б/у (наличие дефекта) (С-14), 70 шт. | 7032,48 |
| 336 | Инсталяция для подвесного унитаза, б/у (С-14), 92 шт. | 14788,08 |
| 337 | Клапан PKTM 111/TPM080/11.40 FI160, 170 шт. | 34598,40 |
| 338 | Клапан PKTM 111/TPM080/11.40 FI200, 61 шт. | 12739,73 |
| 339 | Клапан воздушный КВР с электрическим приводом Ф100мм MRP-3/19 (С-14), 74 шт. | 7169,71 |
| 340 | Клапан для регулирования расхода воздуха с электроприводом круглого сечения d100мм MRP 3/119, б/у (С-14), 214 шт. | 20734,03 |
| 341 | Клапан противопожарный нормально открытый d160мм, с сервоприбором BLF 230-T (PKTM III 60 TPM 080/11), б/у (С-14), 123 шт. | 12516,48 |
| 342 | Клапан противопожарный нормально открытый d200мм, с сервоприбором BLF 230-T (PKTM III 60 TPM 080/11), б/у (С-14), 80 шт. | 8353,92 |
| 343 | Конвектор встр. в пол TK-150*30*07, 014W3, 30 шт. | 6404,04 |
| 344 | Конвектор встр. в пол TK-250*30*07.014W3, 29 шт. | 6190,57 |
| 345 | Конвектор встр. в пол TK-300*30*07, 014B, 15 шт. | 6034,14 |
| 346 | Конвектор, тип 1 3400x200x70 (С-14), 74 шт. | 17364,84 |
| 347 | Конвектор, тип 1 3400x300x70, б/у (С-14), 89 шт. | 20884,74 |
| 348 | Конвектор, тип 2 3400x200x70, б/у (С-14), 88 шт. | 20650,08 |
| 349 | Конвектор, тип 3 3400x300x70 (С-14), 47 шт. | 11029,02 |
| 350 | Конвектор, тип 8 2000x300x70, б/у (С-14), 55 шт. | 6848,82 |
| 351 | Лоток перфорированный 100*3000, б/у (С-14), 492 шт. | 5059,73 |
| 352 | Лоток перфорированный 200*3000, б/у (С-14), 540 шт. | 6207,84 |
| 353 | Лоток перфорированный 300*3000, б/у (С-14), 488 шт. | 7823,62 |
| 354 | Лоток перфорированный 50*300*3000, б/у (С-14), 315 шт. | 5050,08 |
| 355 | Профиль для монтажа скрытых дверей Eclisse 900*2350 SP 100/125, б/у, 119 шт. | 149473,04 |
| 356 | Смеситель скрытая часть Dornbracht Universal (3542597090), б/у, 25 шт. | 22068,00 |
| 357 | Стекло для душа, ориентировочный размер 2400/900, б/у, 100 шт. | 52989,60 |
| 358 | Профиль для с/у. Комплект состоит из 8 профилей, размеры: 3-2,4м, 1-1,97м, 1-0,99, 1-0,85, 1-0,83, 1-0,56, б/у, 146 шт. | 7396,94 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by.
Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by. **Аукцион в очной форме проводится в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** www.iin.by

Победитель аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору электронного аукциона/аукциона затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере **1 % – 2 % от цены продажи лота, в зависимости от цены продажи лота**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона по лотам №№ 1–35:** 27.05.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 16.05.2025 по 26.05.2025 г. до 17.00.
**Дата и время проведения электронного аукциона по лотам №№ 36–71:** 28.05.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 16.05.2025 по 27.05.2025 г. до 17.00.
**Дата и время проведения торгов (аукциона в очной форме) по лотам №№ 72–333:** 17.06.2025 г., начало торгов: 11.00, по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе в очной форме) принимаются по 16.06.2025 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н.
**Дата и время проведения электронного аукциона по лотам №№ 334–358:** 17.06.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 16.05.2025 по 16.06.2025 г. до 17.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# З МІСІЯЙ ВЫХАВАННЯ МІЛАСЭРНАСЦІ

## Месячнік Чырвонага Крыжа праходзіць у Беларусі

Штогадовы месячнік Чырвонага Крыжа працягнецца да пачатку чэрвеня. Традыцыйна ён будзе насычаны інфармацыйнымі, адукацыйнымі і дабрачыннымі акцыямі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Выстаўкі пра работу грамадскага аб'яднання, у тым ліку ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адкрыюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і Віцебскім абласным краязнаўчым музеі; дыялогавая пляцоўка «Шчаслівая сям'я — шчаслівае дзяцінства» пройдзе ў Гомелі; інтэрактыўная пляцоўка будзе працаваць у Дзень сям'і ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага ў Мінску; інтэрактыўная гульня «Бяспечна для жыцця» сумесна з МНС, ДАІ і АСВОД будзе арганізавана ў Гродна.

Як адзначыў **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Дзмітрый ШАЎЦОЎ,** Чырвоны Крыж у Беларусі аб'ядноўвае вялікую колькасць неравнадушных людзей. Па ўсёй краіне дзейнічае 157 раённых арганізацый і каля 8300 пярвічных, куды ўваходзіць больш за 1,1 мільёна чалавек. Дапамагаюць Беларускаму Чырвонаму Крыжу 13,5 тысячы валанцёраў.

Арганізацыя працуе ў розных кірунках. Гэта і дапамога мігрантам, якія прыбываюць у Беларусь. Апошнім часам гэта грамадзяне Украіны, якія прыязджаюць з тэрыторыі Расіі ці Еўропы і маюць намер жыць у нашай краіне. Таксама гэта медыка-сацыяльная падтрымка адзінокіх пажылых людзей. Акрамя таго, БЧК мае 17 каманд хуткага рэагавання, якія маюць навыкі работы ў надзвычайных і крызісных сітуацыях прыроднага і тэхнагеннага характару. Праводзіць Чырвоны Крыж і навучанне навыкам аказання першай дапамогі з выдачай сертыфіката дзяржаўнага ўзору. Дзейнічае і служба вышуку, якая сумесна з іншымі арганізацыямі Чырвонага Крыжа па ўсім свеце шукае сваякоў тых, хто загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны.

— Наша работа — гэта не толькі дапамога чалавеку, які мае ў чымсьці патрэбу, але і выхаванне міласэрнасці ў звычайных грамадзян, якія, адзін раз стаўшы валанцёрамі ў якой-небудзь акцыі, у пераважнай большасці потым звязваюць сваё жыццё з Беларускім Чырвоным Крыжам — дапамагаюць людзям, а самае галоўнае — культывуюць у сабе часцінку міласэрнасці і дабрыні, якая потым вырастае ў добрыя справы, і перадаюць гэта сваім дзецям, — кажа Дзмітрый Шаўцоў.

Толькі летась валанцёры каманд хуткага рэагавання Беларускага Чырвонага Крыжа 288 разоў выязджалі для дапамогі ў надзвычайных і крызісных сітуацыях і аказалі дапамогу 32 тысячам чалавек. Пераважна гэта была дастаўка, транспарціроўка, расчыстка завалаў. Пасля буры, якая пранеслася летам мінулага года па тэрыторыі Гомельскай вобласці, у пацярпелых раёнах валанцёры актыўна дапамагалі насельніцтву ў расчыстцы завалаў і рамонце, дастаўлялі і ўстанаўлівалі электрагенератары. Дзяжурылі валанцёры і на масавых святах — летась на 150 такіх мерапрыемствах яны аказалі першую дапамогу 700 чалавекам.

**Алена КРАВЕЦ.**

ПЕРАМОЖЦАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

# ПАТРЫЯТЫЗМ НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЯДОЎ

## Магілёўскі ваенрук сабраў памяць пра вайну ў кнігу

Кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні магілёўскай СШ № 46 Аляксандр КІРКАЛАЎ лічыць, што патрыятызм лепш выхоўваць на сямейных прыкладах. У Беларусі няма сям'і, якую б не закранула вайна. Нехта змагаўся на фронце, нехта — у тыле, у партызанах або каля станка, забяспечваючы фронт усім неабходным. У красавіку выйшла яго кніга «Памяць пакаленняў у імя будучага. Іх імёны ў гісторыі Перамогі». На 61 старонцы — інфармацыя пра 43 воінаў. Усе яны родныя настаўнікаў і вучняў 46-й школы.



Па адукацыі Аляксандр Кіркалаў юрыст, шмат гадоў адпрацаваў у міліцыі. У 2017 годзе, праходзячы службу ў ДАІ, Аляксандр Кіркалаў разам з калегамі ўдзельнічаў у закладцы капсулы з зямлёй з месцаў пахавання супрацоўнікаў ДАІ ў крыпце Храма-помніка «У гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, якія выратаванню Айчыны нашай паслужылі» ў Мінску. Тады ў яго і ўзнікла ідэя стварэння кнігі-памяці пра семярых супрацоўнікаў ДАІ Магілёўскай вобласці, якія загінулі пры выкананні службовага абавязку. Падчас работы ў міліцыі Аляксандр Кіркалаў зрабіў таксама кнігу-альбом пра дзейнасць экалагічнай міліцыі Магілёва.

Работа з архіўнымі звесткамі захапіла. Аляксандр Кіркалаў знайшоў шмат інфармацыі пра сваіх продкаў і склаў радавод болей чым на 80 імён.

Другі год Аляксандр Кіркалаў працуе ў сістэме адукацыі і працягвае займацца пошукам інфармацыі пра геройчных беларусаў.

— Ідэя стварыць кнігу да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ўзнікла, калі прыйшоў працаваць у школу № 46, — расказвае гісторыю стварэння новага выдання суразмоўнік. — Папрасіў калег і вучняў падзяліцца ваенным мінулым іх родных. Першапачаткова планавалася размясціць толькі звесткі аб франтавіках, але падчас падрыхтоўкі матэрыялу сабралася значна больш, чым думалася.

Выданне дапоўнена архіўнымі данымі Мінабароны Рэспублікі Беларусь і Цэнтральнага архіва Мінабароны Расійскай Федэрацыі. У аснову ляглі падзеі абароны Магілёва і яго вызвалення, інфармацыя пра памятныя месцы і аб абаронцах горада. У кнізе змешчаны фатаграфіі франтавікоў, іх біяграфічныя даныя, узнагароды, водгукі камандзіраў аб подзвігах байцоў. Асобнай тэмай прагучала інфармацыя аб чырвонаармейцах, у гонар якіх названы вуліцы і знакавыя месцы ў горадзе.

— Работа па патрыятычным выхаванні моладзі працягваецца, — кажа Аляксандр Кіркалаў. — Разам са школьнікамі распрацоўваем экскурсійныя маршруты па памятных мясцінах, знаёмімся з гісторыяй, робім шмат фота і відэаматэрыялы. Гэта вельмі важна, бо менавіта на асабістых прыкладах і прыкладах геройчных продкаў выхоўваецца патрыятызм. Нядаўна размясціў інфармацыю



пра кнігу ў TikTok. Расійскае сацыяльна-культурнае аб'яднанне «Рух Саюз» аб'явіла конкурс для моладзі «Памяць пакаленняў: гісторыя героя маёй сям'і», прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. За тры дні маю інфармацыю прагледзела больш чым 3,5 тысячы чалавек. Гэта яшчэ адзін доказ таго, што мы рухаемся ў правільным кірунку. Нельга маўчаць пра наша ваеннае мінулае. Мы павінны рабіць усё для таго, каб свет ведаў, што мы — нацыя пераможцаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Аляксандра КІРКАЛАВА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00102** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Лепельский ремонтно-механический завод», 211099, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Борисовский тракт, 102, тел. 8 (02132) 3-61-86.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12; +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 29.05.2025 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Легковой минивен DODGE CARAVAN, рег. знак BI-2 2501, 2001 г. в., кузов (рама) № 1B4GP25B22B508913, цвет – сине-зеленый металлик, инв. № 2260.

**Местонахождение имущества:** Витебская обл., г. Лепель, ул. Борисовский тракт, д. 102.
**Нач. цена:** 8160,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 816,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by.

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 28.05.2025.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK3012000109330006678 2 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП, расходы на проведение независимой оценки предмета торгов. Расходы Доверителя на проведение независимой оценки составляют 250,00 (двести пятьдесят рублей 00 копеек) белорусских рублей с НДС; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, предусмотренные договором купли-продажи. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты предмета электронных торгов.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: транспорт.

Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (29) 8720308.



**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Лоевского РайПО** (продавец) извещает о проведении **23 мая 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 340/С-290109 общей площадью 376,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/4. Капитальное строение с инв. № 340/С-369 общей площадью 240,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/5. Капитальное строение с инв. №340/С-3720 общей площадью 113,0 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/6. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 323055100001000005

**Начальная цена** продажи без НДС – **11 640,00 бел. руб.** без НДС. **Задаток 1 %** – 116,40 бел. руб.

Условие продажи: имеется необходимость в последующем выделении земельного участка, необходимого для обслуживания и эксплуатации объектов недвижимости. После проведения торгов Продавец уполномочивает Покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка, необходимого для обслуживания предмета торгов, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с Продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению (выделению) земельного участка и прав на него, государственной регистрации и удостоверению договора купли-продажи, перехода права собственности на предмет торгов возлагаются на Покупателя.

**Продавец: Лоевское районное потребительское общество,** Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Батова, 59. Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB 30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 22.05.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

# «Я Б ПРАЙШОЎ ГЭТЫ ШЛЯХ ЯШЧЭ РАЗ З УСІМІ СКЛАДАНАСЦЯМІ І ТРАЎМАМІ»

## Аб чым не шкадуе вялікі чалавек



У беларускім спорце Андрэй Барбашынскі — фігура вялікая. Ніякіх кампліментаў, толькі факты. Алімпійскі чэмпіён 1992 года. Пра тое, як Аб'яднаная каманда СНД, сабраная з гульцоў, якія лічыліся трэцімі нумарамі, катком прайшлася па грандах, ходзяць легенды. Адным з ключавых стваральнікаў таго гандбольнага цуду быў і 22-гадовы Андрэй Барбашынскі. Яго спартыўная зорка запалілася ў невялікім горадзе Ашмяны. І праз шмат гадоў вялікі чалавек малую радзіму не забывае, дапамагае мясцовай дзіцяча-юнацкай школе па гандболе, якая, дарэчы, носіць яго імя і на базе якой праходзяць дзіцячыя спаборніцтвы па гандболе на прызы Андрэя Барбашынскага. Намеснік старшыні Беларускай федэрацыі гандбола, які адказвае за рэгіёны. З нядаўняга часу — дырэктар Рэспубліканскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву — дапамагае развівацца юным талентам з усёй краіны. Пасада няпростая, патрабуе вельмі шмат увагі, адказнасці і ўключэння. Але чым складаней, тым цікавей, сцвярджае Андрэй Барбашынскі. Падтрымлівае яго ў гэтым сям'я, тут таксама ўсё атрымалася. У пачатку мая Андрэй Барбашынскі адзначыў юбілей. І гэта паслужыла найлепшай нагодай, каб пагаварыць не пра спорт, не пра работу, а пра чалавека.

***— Андрэй Станіслававіч, калі б не спорт, то што?***

— Мама распавядала, што я ўжо ў чатыры гады заяўляў пра жаданне гуляць у СКА-Мінск. Абвяргаць словы мамы я не маю права, але ўсё ж гэта не зусім карэктна. Каманда СКА-Мінск пачала ўзыходжанне ў 1976 годзе, калі мне было ўжо шэсць. Ды і наўрад ці я ў чатыры гады разумеў, што такое гандбол. У дзяцінстве я быў даволі лянівым малым, які не рваўся займацца спортам, мне больш падабалася вучыцца. Але вось так склалася жыццё, што мая вучоба працягвалася ў спартыўным інтэрнаце. І, як аднойчы заўважыў тата, гэта быў шчаслівы паварот. Ён тлумачыў гэта тым, што мой добры даверлівы характар мог прывесці мяне і на крывую дарожку. І яшчэ тата жартаваў: з маім ростам я б мог галінкі ў дрэў абразаць. Але калі сур'ёзна, то я вельмі ўдзячны лёсу за тое, што знайшоў сябе ў спорце. Як асоба я развіваўся ў складаны пераменлівы час, усякае магло быць у маім лёсе. Але было толькі добрае.

***— Відавочна, які момант у спартыўнай кар'еры вы назаваце самым шчаслівым. А які быў самым горкім?***

— Наш бяздарны пройгрыш шведам на чэмпіянаце свету 1991 года. Для мяне асабіста гэта двайное засмучэнне, таму што я быў капітанам каманды. Мы вельмі недарэчна ўпусцілі свой шанц стаць чэмпіёнамі свету ў другі раз. Так, на Алімпіядзе мы шведаў абыгралі, але за той пройгрыш крыўдна дагэтуль. Цяпер разумею, што няўдачы загартоўваюць. І калі адзін раз надломваешся псіхалагічна (няважна, у якім узросце), з'яўляецца ўнутраны страх памыліцца, зрабіць нешта не так. Таму першае, чаму павінен навучыцца спартсмен, — адкідаць усе перажыванні і ісці наперад, як бы ні было складана.

***— Гэтаму вучылі ў СКА-Мінск?***

— У тым ліку. Пра тое, што я быў у спісе найлепшых бамбардзіраў Савецкага Саюза, даведаўся ад журналіста Сяргея Лісічкіна, які падняў архівы. Ну, так, быў, таму што ў мяне былі класныя партнёры, з якімі было гонарам выходзіць на пляцоўку. Для мяне гонар быць часткай той каманды, трэніравацца пад кіраўніцтвам Спартака Пятровіча Мірановіча. Мы марылі гуляць за СКА-Мінск. І сёння я мару, каб СКА-Мінск адрадзіўся, грымеў, як раней, каб маладыя гульцы марылі гуляць у дадзенай камандзе. Таму што гэта гісторыя не толькі гандбалістаў, гэта гісторыя сотняў людзей, якія стваралі тую вялікую каманду.

***— Нядаўна ў Ашмянах прайшоў чарговы турнір па гандболе на прызы Андрэя Барбашынскага. Як узнікла ідэя запусціць гэты праект?***

— Гэта ідэя Мікалая Мікалаевіча Тадарашкі, былога дырэктара «Гараднічанкі». Першы турнір быў мужчынскім на чатыры каманды і праходзіў у Гродне, другі, падлеткавы, ужо на шэсць каманд. А паколькі мая малая радзіма — Ашмяны, вырашылі перанесці туды. І ўжо дзевяць гадоў гэты турнір — Ашмянская традыцыя. Мы стараемся праводзіць яго так, каб усім было цікава і займальна. Падбіраем каманды, аднолькавыя па сваім узроўні, каб была здаровая канкурэнцыя. Паколькі ўдзельнікі — 15-гадовыя хлопцы, у дзень яны гуляюць два матчы па 25 хвілін, каб «наеліся» гандболам і атрымалі ад яго задавальненне. Аддачу ад турніру адчувае і прафесійны спорт. Кожны год некалькі ўдзельнікаў турніру паступаюць у вучылішча алімпійскага рэзерву. Ігар Бяляўскі прайшоў праз наш турнір. Мацвей Барбашынскі, як і ўсе хлопцы, народжаныя ў 2000-х, пачыналі свой шлях у прафесійным гандболе з гэтага турніру.

***— Улічваючы, што Мацвей і Захар знайшлі сябе ў спорце, спартыўнай дынастыі Барбашынскіх быць. Сыны моцна на вас падобныя?***

— Ростам яны сапраўды пайшлі ў мяне. Малодшы, Захар, прыкладна 1.98 метра, можа, ужо нават 2 метры. Мацвей планку ў 2.05 метра ўжо даўно перарос. У нас траіх аднолькавая хада, ходзім, закідваючы руку назад, як і мой бацька. А вось характары розныя. Мацвей пайшоў у маму: дысцыплінаваны, арганізаваны, у яго ўсё павінна быць раскладзена па палічках. Захар, як і я, на месцы не сядзіць, увесь час у руху, увесь час яму кудысьці трэба, толькі выбраў баскетбол. Характары ў іх розныя, але класныя. Вялікі дзякуй маёй жонцы за выхаванне такіх хлопцаў. У Ірыны трое дзяцей, я, дарэчы, самы паслухмяны. Мы ўсе ставімся да яе з вялікай павагай і любоўю. І хлопцам не стамляюся паўтараць, што мама адна і яе трэба шанаваць і берагчы.

***— Як быць «бацькам» 618 дзяцей, якія вучацца ў вучылішчы алімпійскага рэзерву?***

— У першы дзень работы ў вучылішчы я папярэдзіў калектыў, што гэта нашы дзеці, і ставіцца да іх мы павінны, як да родных. А самае складанае — выхоўваць дзяцей на сваім прыкладзе, а не проста казаць ім прыгожыя словы, вучыць жыццю. Часта можна пачуць, што гэта пакаленне «сапсаванае». Не, яно проста іншае. Бо яны жывуць у шчаслівы час, у клопаце, дастатку, ім не трэба выгрызаць усё ў гэтым жыцці, як даводзілася нам. Вядома, нашы дзеці павінны жыць лепш, чым мы. Але з-за гэтага яны як быццам знаходзяцца ў лёгкай спячцы, многія не маюць выразнай мэты на жыццё. І «абудзіць» іх, запаліць агеньчык — наша задача.

***— Андрэй Станіслававіч, вы адзін з нямногіх чэмпіёнаў, хто адкрыта кажа, што вялікі спорт — вельмі складаны шлях, на якім даводзіцца многае пераадольваць. Гэта таго варта?***

— Адназначна варта. Для таго, каб чагосьці дасягнуць, трэба ад многага адмаўляцца, ад забаў, вольнага часу, часам нават ад здароўя. Калі ты ў спорце, пра гэта не думаеш. І я б прайшоў свой шлях яшчэ раз, з усімі траўмамі, хваробамі, складанасцямі, таму што тыя эмоцыі, той адрэналін, які ты атрымліваеш, — вартыя ўсяго.

***— Вы адчуваеце сябе шчаслівым чалавекам?***

— Безумоўна. Дзве пяцёркі — выдатная дата, ты ўжо не малады, але яшчэ і не надта дарослы. І, як я жартую, мне яшчэ 45 гадоў да фінішу. Вядома, я шчаслівы чалавек, у мяне цудоўная сям'я, выдатная жонка, сыны, побач мама. Я жыву ў спакойнай мірнай краіне, у мяне безліч планаў на будучыню. А калі нехта плюе ў спіну, дык гэта азначае толькі тое, што я наперадзе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**


## Извещение о проведении повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44** | | |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **23.05.2025, 11.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг»** | | |
| | **Лот № 1** | **Лот № 2** | **Лот № 3** |
| **Предмет аукциона** | **право заключения договора аренды недвижимого имущества – капитального строения с инвентарным номером 644/С-2769** | **право заключения договора аренды недвижимого имущества – части капитального строения с инвентарным номером 644/С-38252** | **право заключения договора аренды недвижимого имущества – части капитального строения с инвентарным номером 644/С-3244** |
| **Общая площадь, кв. м** | 1 086,2 | 173,3 | 270,0 |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленинского Комсомола, 22 | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 41 | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 2 этаж |
| **Характеристика недвижимого имущества и иные сведения** | оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, подъездные пути | оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, подъездные пути, отдельный вход | оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией |
| **Условия аукциона** | **целевое использование имущества** – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения офиса, детских развлекательных аттракционов, оказания услуг (за исключением ритуальных), розничной торговли непродовольственными товарами; за исключением размещения объектов общественного питания, игорных заведений и аптек | **целевое использование имущества** – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения офиса, детского развлекательного центра (аттракционов), оказания услуг, розничной торговли непродовольственными товарами, кроме бывших в употреблении и ритуального назначения; за исключением размещения игорных заведений и аптек | **целевое использование имущества** – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения развлекательного объекта для досуга детей |
| **Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб.** | 1 529,10 | 569,25 | 886,88 |
| **Сумма задатка, руб.** | 1 529,10 | 569,25 | 886,88 |
| **Срок договора аренды** | 5 лет | 5 лет | 3 года |
| **Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый арендодателем или размер арендной платы** | 3,0 – для площадей первого и второго этажей (781,5 кв. м), 1,5 – для площадей подвальных помещений (304,7 кв. м) | 3 (три) | 3 (три) |
| **Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в предусмотренных законодательством случаях, руб.** | 4 200,00 | 4 200,00 | 4 200,00 |

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, финансовый отдел, **с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 22 мая 2025 г. включительно,** телефоны: 8 (0174) 26 07 31, 23 65 26. Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (https://au.nca.by), Солигорского районного исполнительного комитета – www.soligorsk.gov.by (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы), открытого акционерного общества «Солигорскторг» – www.soligorsktorg.by (Главная/Аукционы).

УНП 600122715

СПОРТ-ТАЙМ

# КАМАНДА, ЯКОЙ УДАЛОСЯ НЕМАГЧЫМАЕ

## Зборная Беларусі па пляжным футболе — сярэбраны прызёр чэмпіянату свету



Калі б трэба было апісаць адным словам выступленне нацыянальнай зборнай Беларусі па пляжным футболе на чэмпіянаце свету, гэта было б слова «сенсацыя». А калі ў двух словах, то «грандыёзная сенсацыя». Давайце шчыра: не так часта беларускія зборныя па гульнявых відах спорту радуюць краіну сярэбранымі медалямі чэмпіянатаў свету. А пляжныя футбалісты парадавалі!

І, як заўважыў у сваім віншаванні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, гэта серабро з адлівам золата. У фінале беларуская каманда сустрэлася з камандай Бразіліі. Менавіта гэта краіна лічыцца радзімай пляжнага футбола, а яе каманда 16 разоў станавілася чэмпіёнам свету. Для даведкі: у гісторыі было ўсяго 23 чэмпіянаты свету па пляжным футболе. Нават калі б моцна пастарацца, больш грознага саперніка знайсці б не атрымалася. Але беларусы не спалохаліся і далі грандам бой. І гэта пацвярджае вынік — 3:4. Усяго адзін гол прайгралі спартсмены з краіны ну зусім не прыдатнай для развіцця пляжнага футбола сапернікам, якія могуць жыць на тых пляжах і трэніравацца суткамі.

«Сёння вы стварылі сенсацыю, назаўжды ўпісаўшы свае імёны ў гісторыю сусветнага і айчыннага спорту», — адзначыў у сваім віншаванні прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Віктар Лукашэнка. Ён адзначыў камандную гульню, яркі талент, бязмерную працавітасць і неверагодныя вынікі, якія сталі візітнай карткай беларускага пляжнага футбола. «Пры падтрымцы трэнераў і ўсёй каманды вам удалося тое, што здавалася немагчымым. Вялікае дасягненне — прабіцца ў эліту сусветнага футбола ў такі кароткі тэрмін і стабільна дэманстраваць бліскучую гульню на роўных з найлепшымі з найлепшых, а ўжо падняцца на п'едэстал, саступіўшы толькі крыху ў фінале прызнаным лідарам планеты, — гэта поспех, годны апладысментаў!» — сказана ў віншаванні.

На чэмпіянаце свету адзначылася не толькі ўся беларуская каманда, але і асобна ўзятыя спартсмены. Нашы футбалісты заваявалі тры індывідуальныя ўзнагароды. Ігар Брыштэль стаў найлепшым бамбардзірам турніру. На яго рахунку 11 мячоў. Ён заняў другое месца ў намінацыі «Найлепшы гулец». Міхаіл Аўгустаў забраў званне «Найлепшага варатара». А ў паўфінале з Сенегалам ён быў прызнаны самым карысным гульцом.

Варта сказаць і пра чалавека, які прывёў каманду да гістарычнага дасягнення. З 2017 года з беларускай зборнай працуе іспанскі трэнер Нікалас Альварада. Цікава, што да гэтага з камандай працаваў бразілец Марк Актавія, які падрыхтаваў чэмпіёнаў свету — 2025. Напэўна, ён ганарыцца поспехамі сваіх мінулых падапечных. Да гэтых медалёў Нікалас Альварада са сваёй камандай ішлі паступова, крок за крокам падымаліся вышэй. На чэмпіянаце свету 2023 года яны былі чацвёртымі, аналагічнае месца занялі ў мінулым годзе. І вось — прарыў. Не выпадковы, а цалкам заслужаны, напрацаваны потам і крывёю. Прарыў, які дэманструе ўжо назапашаны досвед і яшчэ нерэалізаваны патэнцыял.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

НАДВОР'Е

# БАЛТЫКА ПРЫНЯСЕ НАМ ДАЖДЖЫ І НАВАЛЬНІЦЫ

## Сіноптыкі папярэджваюць, што ў сераду і чацвер месцамі чакаюцца даволі моцныя лівні

Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, некалькі дзён гэтага тыдня пройдуць пад штармавымі папярэджаннямі начных замаразкаў. Усё таму, што з аўторка ўмовы надвор'я ў Беларусі будуць вызначаць халодныя няўстойлівыя паветраныя масы і малаактыўныя франтальныя раздзелы, якія ссоўваюцца з боку паўночных шырот.



У гэтыя суткі (13 мая) надвор'е ў краіне будзе вызначаць халодная няўстойлівая паветраная маса. Ноччу пераменная воблачнасць, днём воблачна з праясненнямі. Уначы месцамі, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Ноччу і раніцай у асобных раёнах будзе згушчацца слабы туман. Вецер паўночна-заходні ўмераны, удзень парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ноччу складзе ад плюс 1 да плюс 5 °С, месцамі па краіне чакаюцца замаразкі да мінус 4 °С. Максімальная тэмпература паветра днём будзе павышацца да плюс 11—17 °С. Атмасферны ціск ноччу не зменіцца, днём будзе слаба падаць.

Істотнае змяненне надвор'я чакаюць ужо ў сераду. Наша краіна будзе знаходзіцца ў полі паніжанага атмасфернага ціску, раніцай і днём адаб'ецца ўплыў сістэмы франтальных раздзелаў, якія ссоўваюцца з боку Балтыйскага мора. Уначы пераменная воблачнасць, удзень воблачна з праясненнямі. Ноччу пераважна без ападкаў, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах па захадзе Беларусі — моцныя дажджы і навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, удзень месцамі парывісты, пры навальніцах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу складзе ад плюс 1 да плюс 6 °С, на глебе месцамі замаразкі да мінус 2 °С. Максімальная тэмпература днём будзе дасягаць плюс 11—18 °С.

Дажджліва будзе ў нас і ў чацвер. Воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, ноччу месцамі чакаюцца моцныя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер пераменных напрамкаў парывісты, у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 °С на паўночным захадзе да плюс 9 °С на паўднёвым усходзе краіны. У сярэдзіне дня тэмпература будзе ў раёне ад плюс 7 да плюс 13 °С, у паўднёва-ўсходніх раёнах Беларусі — да плюс 15 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| **МІНСК** 754 мм рт.сл. | +5..+7°С | +14..+15°С |
| **ВІЦЕБСК** 754 мм рт.сл. | +3..+6°С | +11..+13°С |
| **МАГІЛЁЎ** 755 мм рт.сл. | +4..+5°С | +13..+15°С |
| **ГОМЕЛЬ** 756 мм рт.сл. | +5..+6°С | +15..+16°С |
| **ГРОДНА** 755 мм рт.сл. | +3..+5°С | +12..+13°С |
| **БРЭСТ** 756 мм рт.сл. | +5..+7°С | +13..+14°С |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Поўня 12.05—19.05. Месяц у сузор'і Стральца.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— магая геамагнітная бура

**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| **МАСКВА** | +11..+13°С |
| **С.-ПЕЦЯРБУРГ** | +11..+13°С |

13 МАЯ | Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1905** год — нарадзіўся Сцяпан Сцяпанавіч Манковіч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную з ліпеня 1941 года — у падполлі, з сакавіка 1942-га — у партызанах, камісар атрада партызанскай брыгады «Жалязняк», адначасова сакратар Бягомльскага падпольнага райкама КП(б)Б. Пасля вайны — на савецкай і партыйнай рабоце.

**У той жа дзень** нарадзілася Стэфанія Міхайлаўна Станюта, актрыса, народная артыстка БССР і СССР. Сцэнічную дзейнасць пачала ў 1919 годзе ў Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі. З 1920-га — у Беларускім дзяржаўным тэатры, з 1931 года — у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Выканаўца характарных, камедыйных і драматычных роляў. Яе творчасці былі ўласцівы глыбокае пранікненне ў псіхалогію вобраза, эмацыянальнасць, выразнасць слова, жэста, мімікі, яркая камедыйнасць, умелае выкарыстанне іроніі і гратэску. Стварыла шэраг народных характараў. Выканала больш як 60 роляў у кіно.

**1933** год — нарадзіўся Аляксандр Кішчанка, жывапісец, габеленшчык, мазаіст. Педагог. Народны мастак Беларусі. Аўтар «Габелена стагоддзя», які адлюстроўвае найбольш вядомых палітычных дзеячаў ХХ ст. (Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь 1996 года). Яго габелен «Чарнобыль» знаходзіцца ў будынку ААН у Нью-Ёрку.

У свеце

**1501** год — фларэнтыйскі падарожнік Амерыга Веспучы адправіўся ў вандроўку на Захад, у ходзе якой высветліў, што Калумб адкрыў новы кантынент, а не пабываў у Індыі, як той лічыў.

**1637** год — кардынал Рышэлье, памятаючы аб сваіх ворагах, загадаў закругліць усе кінжалы, якія выкарыстоўваліся падчас прыёму ежы для наразання мяса, стварыўшы такім чынам сталовы нож.

**1907** год — адкрыўся V з'езд РСДРП, які праходзіў у Лондане да 1 чэрвеня і атрымаў назву Лонданскага з'езда. Менавіта тут адбылося знаёмства двух дэлегатаў — У. І. Леніна і І. В. Сталіна.

Шаноўную калянжанку
**Вольгу Андрэеўну ГЕЦЭВІЧ**
шчыра віншуем з прыгожай круглай датай! Зычым моцнага здароўя, спору і плёну ў працы, шчасця ў асабістым жыцці!



Каб зоркі падалі ў руку,
Каб век,
ва ўсім —
спрыяла неба!
І каб хапала ў кашальку
На ўсе надзённыя
патрэбы.

***Звяздоўцы.***

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 951 Індэкс 63850. Зак. № 1046.

Нумар падпісаны ў 19.30 12 мая 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12